Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

10 год выданьня.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў)

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. На 3 м. — 2 р. 70 к. На 6 м. — 4 р. — к. На 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к., мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нонпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нонпарэлі насярод тэксту 1 р. — к. За радок нонпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьцешныя на 50 проц. даражэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт 35 кап. За кожны дадатковы 15 ". Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт 15 ", за кожны дадатковы 5 ". Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх паштова-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 201 (2690) Серада, 4-га верасьня 1929 г.

...цкая Беларусь" ...а 13, госудр- библиотека. адзін экз.

ЗАГАДЗЯ ПАДРЫХТУЕМСЯ да новага будаўнічага сэзону.

Асаблівага роскьвіту наша будаўніцтва дасягнула ў некалькі апошніх год. Будуюцца новыя фабрыкі, заводы і будуюцца школы, культасьветныя ўстановы; будуюцца жыльлёвыя памяшканьні для рабочых і служачых Штогод на нашай зямлі вырастаюць новыя гмахі Асінбуду, Унівэрсытэцкага гарадка, Бабруйскага камбінату і соцен другіх прадпрыёмств.

Тэмп нашага будаўніцтва, які мы маем на сёньняшні дзень, у далейшым будзе ўзмацняцца і нашае будаўніцтва на 17 проц. перагоніць тую намётку, якую мы зрабілі ў пяцігадовым пляне. Адсюль зразумела, што справе будаўніцтва надаецца асабліва пільная ўвага і апошняе павінна быць у асяродку работы **усіх** партыйных, савецкіх і прафсаюзных арганізацый. Апошні год, трэба сказаць, ужо быў пераломным у гэтай справе; партыя і ўрад ужо мабілізавалі частку ўвагі партыйных і савецкіх арганізацый да такога важнага пытаньня, як нашае будаўніцтва.

Але-ж ня гледзячы на гэта, на пабудовах наглядаецца яшчэ многа недахопаў, а нярэдка і простых скрыўленьняў партыйнае лініі. Так, што год мы бачым спазьненьне з пачаткам работ і несваечасовае выпаўненьне намечанага пляну.

Болей таго, нашыя пляны на некалькі разоў перакройваюцца ўжо тады, як пачалася самая будоўля. Нярэдка прыходзіцца перабудоўваць пачынаючы ад самага фундаманту. Усё гэта выклікае тое, што нашыя будаўнічыя арганізацыі дагэтуль ня выканалі дырэктывы аб зьніжэньні сабекошту будаўніцтва на 15 процантаў.

Зразумела, што далей, асабліва пры ўзмоцненым тэмпе нашага будаўніцтва, так весьці справу ня можна. З пачаткам будаўніцтва на чарговы год нам трэба пазбавіцца ад цэлага шэрагу недахопаў.

Аб гэтым і гаворыць пастанова Эканамічнае Нарады пры СНК БССР, якая сёньня зьмяшчаецца ў нашай газэце. Гэтая пастанова пра мерапрыемствы да падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону на 1929-30 год. У першую чаргу ставіць пытаньне і абавязвае ўсе будаўнічыя арганізацыі **новы будаўнічы сэзон распачаць сваечасова, у тэрмін**. Дзеля гэтага трэба, каб праграма будаўніцтва была намечана яшчэ ў гэтым календарным годзе і каб намечана была, як мага скарэй. Трэба назначыць аб'ект будаўніцтва, знайсьці месца, вызначыць агульны кошт будаўніцтва, знайсьці крыніцы крэдытаваньня, вызначыць тэрмін пабудовы. Трэба сваечасова выканаць складаньне праэктаў і рабочых дэталяў будаўніцтва, каб у будаўнічым сэзоне ня было аніякае затрымкі. Ужо зараз належыць пачаць усю падрыхтоўчую работу да будаўніцтва. Трэба зрабіць усе заяўкі, трэба канчаткова зацьвердзіць пляны, трэба падумаць і аб выканаўцах плянаў. Не пазьней 15-га сьнежня павінны быць зроблены заяўкі на рабочую сілу. У плянах павінна быць прадугледжана пытаньне аб падрыхтоўцы інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналю. Трэба таксама апошні вызваліць ад розных тэхнічных функцый, якія часта яшчэ выконваюцца інжынэрамі і тэхнікамі.

Для таго, каб выканаць пляны сваечасова, каб можна было яшчэ больш пашырыць будаўніцтва, Эканомнарада пры СНК БССР у апошняй сваёй пастанове асабліва падкрэсьлівае неабходнасьць патаненьня будаўнічых матар'ялаў, прадоўжаньня вытворчага сэзону і больш рашучае правядзеньне рацыяналізацыі на будаўніцтве і на прадпрыёмствах, якія выпрацоўваюць будаўнічы матар'ял.

Асобае мейсца займае правядзеньне бесперарыўнага рабочага тыдню на ўсіх прадпрыёмствах, якія маюць сувязь з будаўніцтвам. Для паскарэньня будаўніцтва выкананьне гэтага пункту набывае асаблівую вартасьць.

Праведзены вопыт на некаторых цаглянных заводах Белдзяржбуду гаворыць за тое, што гэтае мерапрыёмства цалкам і поўнасьцю сябе апраўдала і павінна быць абавязкова ўведзена на ўсіх прадпрыёмствах, на ўсіх пабудовах.

У надыходзячы асеньні і зімовы перыяд усе будаўнічыя арганізацыі павінны заняцца дэталёвай падрыхтоўкай будаўніцтва на будучы год. За гэты час трэба распрацаваць ня толькі агульныя пляны і праэкты, але і распрацаваць пытаньне аб паляпшэньні якасьці і патаненьні нашага будаўніцтва. Гэтыя дзьве задачы застаюцца галоўнымі пры ў[illegible] ходзе будаўніцтва.

Падрыхтоўкай да будаўніцтва павінны заняцца ня толькі будаўнічыя арганізацыі, але і тыя ўстановы і арганізацыі якія будуць рабіць заказы на будаўніцтва. Трэба зараз-жа зрабіць заяўкі і дагаварыцца наконт тэрміну. Не прапускаючы ніводнага дня, трэба брацца за падрыхтоўку да новага будаўніцтва, каб сваечасова падрыхтавацца да будаўнічага сэзону на 1929-30 год. Ад сваечасовай падрыхтоўкі, ад належнай прадуманасьці плянаў і ад тэй увагі, якую нададуць гэтаму пытаньню ўсе партыйныя, савецкія і прафсаюзныя арганізацыі будзе залежыць пасьпяховае выкананьне і большы эфэкт нашага будаўніцтва.

ЗНОЎ „НЕПАРАЗУМЕНЬНІ“.

У сваёй уступнай прамове, зробленай на адчыненым кангрэсе трэд-юніёнаў у Бэльфасьце старшыня генэральнай рады трэд'юніёнаў Бэн-Цілет ня здолеў, вядома, абыйсьці моўчкі хвалюючае ўсю ангельскую рабочую клясу пытаньне аб аднаўленьні дыплёматычных зносін паміж Англіяй і СССР. «Я рашуча настаіваю на пастаноўку пытаньня аб згодзе з Расіяй на адным з першых пасяджэньняў парляманту і спадзяюся, што ўрад здолее выканаць абяцаньні, дадзеныя ім у часе выбараў».

Вэрсія аб непаразуменьнях, як быццам перашкаджаючых аднаўленьню англа-савецкіх адносін была пушчана, як вядома, у ход афіцыёзам рабочай партыі „Дэйлі Гэральд“

Калі тав. Даўгалеўскі, згодна атрыманых інструкцыям, меў намер весьці перамовы аб працэдуры прызнаньня, выходзячы з таго, што прызнаньне павінна наступіць зараз-жа, Гэндэрсон катэгарычна заявіў тав. Даўгалеўскаму, што безадкладнае аднаўленьне зносін немагчыма і пытаньне павінна яшчэ абгаварвацца ў парлямэнце, і, што ў парлямэнце ён зьбіраецца ставіць пытаньне нават толькі пасьля вырашэньняў пытаньняў аб узаемных прэтэнзіях і так званай прапагандзе.

Між іншым, пры шчырым жаданьні аднавіць дыплёматычныя зносіны, зусім незразумела, чаму Макданальд нават не спрабаваў запытаць згоды парлямэнту да зачыненьня парлямэнцкай сэсіі. Пры наяўнасьці гэтых умоў з боку ангельскага ўраду, пры адмове яго ад безадкладнага аднаўленьня зносін, з спасыланьнем на парлямант, Макданальд раней яшчэ спасылаўся на даміёны і іх урады і пры досьледах папярэдніх перамоваў па сутнасьці спрэчных пытаньняў, на якія савецкі ўрад згадзіцца ні ў якім разе ня можа, абгаварэньне працэдуры прызнаньня ўжо ня мае сэнсу.

Надзвычайна характэрна, што сам ангельскі ўрад ня лічыў патрэбным выступіць з афіцыйным растлумачэньнем па прычыне „непаразуменьня“, а прадаставіў няўдзячную ролю цэнтральнаму органу рабочай партыі, які дзейнічаў у прыватным парадку. Прадпрынятыя, па нашым зьвесткам, у апошнія часы ангельскім урадам неафіцыйныя крокі таксамы не ўняськлі выразнасьці ў становішчы і «непаразуменьня» нікольк ня зьнішчылі.

Савецкі ўрад свой пункт гледжаньня выказаў зусім ясна. Абсалютна няма патрэбы ні ў якіх эківоках, ні ў якіх закулісных камбінацыях, ні ў якіх пусканьнях пылу ў вочы, ні ў якіх спробах каго-небудзь ашукаць, падта ўжо белымі ніткамі шытых, каб зразумець і ўявіць пункт гледжаньня савецкага ўраду.

Ангельскаму ўраду добра вядомы тыя перамовы, на падставе якіх утвараліся нармальныя дыплёматычныя зносіны СССР ні з адным дзесяткам дзяржаў, вядомы тыя абставіны, якія савецкі ўрад у гэтых умовах бярэ на сябе пры вядомым двухбаковым характэры гэтых абставін. Ангельскаму ўраду вядомы пункт гледжаньня савецкага ўраду па пытаньні аб прапагандзе («Праўда» нядаўна мела выпадак прывесьці некаторыя матар'ялы аб ангельскай прапагандзе і ня толькі прапагандзе супроць савецкага ўраду). Няхай адкажуць, нарэшце, ясна ангельскай рабочай клясе, ці доўга яшчэ будзе працягвацца гэта дыплёматычная, мякка кажучы гулянка памечанымі картамі. А „непаразуменьні“ няхай скончаць утвараць іх там, дзе іх зусім няма. Становішча зусім зразумела.

Сур'ёзнасьць мусульманскага руху.

ПАРЫЖ, 2-9. Апублікавана афіцыёзнае французскае паведамленьне, у якім гаворыцца: „французскі ўрад прыняў энэргічныя захады на Сірыйскай мяжы з мэтаю перашкодзіць пераходу арабаў праз мяжу на той ці іншы бок. Дзеля гэтага арабы, якія зьявіліся ў Палестыне, маглі прасякнуць толькі з Трансіярданіі.

Ня гледзячы на гэту заспакайваючую заяву, увесь друк падкрэсьлівае сур'ёзнасьць масульманскага руху, які накіраваны, водлуг слоў „Тан“, як супроць сіянізму, які знаходзіцца пад апекай Англіі, таксама і супроць Англіі.

Адчыніўся плянарны сход Лігі.

ЖЭНЕВА, 2-9. Сёньня адчыніўся 10 пленарны сход лігі нацый. Старшынёй пленарнага сходу абіраецца Гвэрэро, прадстаўнік Сальвадора. Гэта адна са звычайных дэманстрацый «уважлівых адносін» Лігі Нацый да краін Лацінскай Амэрыкі, буйнейшыя дзяржавы якой (Аргенціна, Бразілія) як і раней ня прымаюць удзелу ў Лізе.

На парадку пленуму і адначасова сэсія рады Лігі, якая адбываецца, пакуль няма актуальных палітычных пытаньняў.

Змова супроць нанкінскай клікі.

Расьце нездаволенасьць супроць крывавай палітыкі Чан-Кай-Шы.

ЗАМАХ НА ЧАН-КАЙ-ШЫ.

ТОКІЁ, 2-9. Учора 4 салдаты ўварваліся ў кватэру Чан-Кай-Шы дзеля замаху на яго жыцьцё. Чан-Кай-Шы ўдалося схавацца. Салдаты ўцяклі.

Сьледам за замахам на жыцьцё Чан-Кай-Шы каля 70 чалавек напалі на будынак, дзе жыве міністр фінансаў нанкінскага ўраду Сун-Цзо-Вэн. Аднак, варце ўдалося адбіць напад.

* * *

ШАНХАЙ, 2-9. У мінулым тыдні ў Шанхаі выкрыта змова, у якой замешаны „телохранители“ Чан-Кай-Шы, якія прабавалі яго забіць. Змоўшчыкі дамагаюцца зьмены нанкінскага ўраду. Кітайскі друк не публікуе ніякіх даных, якія датычацца змовы.

„Перамога“ мукдэнцаў.

ПЭЙПІН, 2-9. Водлуг паведамленьня Говэнь, намесьнік старшыні паўночна-ўсходняга (Мукдэнскага) камітэту шляхаў зносін Гао-Чы-Йі ўступіў на пасаду дырэктара Пэйпін-Мукдэнскай чыгункі.

У гутарцы з журналістамі Гао-Чы-Йі падкрэсьліў, што ён назначан на сваю пасаду мукдэнскім урадам.

У палітычных колах зазначаюць, што гэта прызначэньне зьяўляецца яўнай перамогай міністра шляхаў зносін Сунь-Фо.

МІНІСТР „УЦЯКАЕ“.

ШАНХАЙ, 2-9. Водлуг паведамленьня кітайскага друку, міністр шляхаў зносін нанкінскага ўраду Сун-Фо падаў у адстаўку.

ВЫКЛЮЧНА НАНКІНСКІМ УРАДАМ.

ТОКІЁ, 2-9. Водлуг слоў японскага пасла ў Кітаі Ёсізава, Чжан-Сюэ-Лян заявіў, што савецка-кітайскія перамовы аб УК чыгунцы будуць весьціся выключна нанкінскім урадам.

НАНКІН АРГАНІЗУЕ БАНК.

ТОКІЁ, 31-8. Японскія газэты паведамляюць, што нанкінскі ўрад парашыў заснаваць у Харбіне каля кітайскай чыгунцы банк.

ЗВАРОТ КАНЦЭСІІ.

ПЭЙПІН, 2-9. 31-га жніўня ў Цянзіне падпісана згода аб звароце Бэльгійскай канцэсіі ў Цянзіне Кітаю.

Згода павінна быць рацыфіцыравана нанкінскім урадам і Бэльгійскім парлямантам.

БАРАЦЬБА З ФАШЫЗМАМ.

У Юнацкі Дзень.

СТАКГОЛЬМ, 30-8. У Міжнародны Юнацкі Дзень турэцкі камсамол наладжвае дэманстрацыі ў сталіцы і правінцыі. Галоўны лёзунг дэманстрацыі— барацьба супроць імпэрыялістычнай вайны і абарона СССР.

На зьезьдзе прафбюракратаў.

БЭЛЬФАСТ. 2-IX. Пасьля прамовы Бэн-Цілета, зьезд ангельскіх прафсаюзаў перашоў да абгаварэньня розных тэхнічных і зьмешаных пытаньняў. Некаторыя прадстаўнікі левага крыла спрабавалі выразіць пункт гледжаньня меншасьці па паасобных пунктах справаздачы генэральнай рады, але большасьць зьезду зрабіла абструкцыю і ня дала магчымасьці ім гаварыць.

Прынята рэзалюцыя аб беспрацоўі, якая абмяжоўваецца патрабаваньнем аб пераглядзе акту аб беспрацоўі.

Прадстаўнік саюзу горнарабочых і муніцыпальных рабочых Хэйдэй, падтрымліваючы гэту рэзалюцыю, заявіў, што ён не прыналежыць да ліку тых, якія хочуць ставіць палкі ў колы рабочаму ўраду ў момант, калі ён прышоў да ўлады. Гэтыя словы пакрыты бурнымі воплескамі.

На карысьць „Юманітэ“

ПАРЫЖ. 2-IX. Агульны сход акцыянэраў рабоча-сялянскага банку прайшоў з вялізарным уздымам і аднадушшам. Аднагодна зацьверджана справаздача аб дзейнасьці банку і рэзалюцыя пратэсту аб узьнятай супроць яго кампаніі. Старшынёй праўленьня банку абраны Гаршэры.

Збор на карысьць «Юманітэ» дасягнуў 252.000 франкаў і працягваецца з посьпехам.

У ДЗЕНЬ МЮД'у.

ГЕЛЬСІНГФОРС, 2-9. Водлуг вестак друку, дэманстрацыі моладзі ў Гельсінгфорсе, якія адбыліся 1 верасьня, былі разагнаны паліцыяй.

БАЯЦЦА, КАБ НЕ ДАВЕДАЛІСЯ ПРАЎДЫ АБ СССР.

ГЕЛЬСІНГФОРС, 2-9. Членам фінляндзкай прафсаюзнай дэлегацыі адмоўлена ў выдачы замежных пашпартоў для паездкі ў СССР.

ЭПІДЭМІЯ Ў АСТРОЗЕ.

БЭРЛІН, 1-9. Водлуг паведамленьня „Бэрлін ам Морген“, у Запэнбургскім катаржным астрозе, дзе знаходзіцца шмат палітычных, выбухнула эпідэмія. Захварэла 50 чалавек з агульнага ліку зьняволеных у 350. Існуе думка, што зьняволеныя захварэлі тыфам.

У ПОЛЬШЧЫ.

„ПОЛЬСКІ БАЛАГАН“.

Гэткім імем афіцыйны орган польскага стралковага саюзу „Стралец“ характарызуе сьвістаскокі, якія адбываюцца ў галіне па-за вайсковай падрыхтоўкі насельніцтва.

Шэраг арганізацый, цалкам прысьвечаных справе па-за вайсковай падрыхтоўкі (як стралковы саюз) ці часткова адданых гэтай справе, канкуруюць ня толькі між сабою, але і між асобнымі атрадамі і часьцямі аднае арганізацыі. Здараюцца „цікавыя“ зьявішчы: орган па-за вайсковай падрыхтоўкі чыгуначнікаў пераманьвае да сябе, дзякуючы службоваму ўплыву, атрад стральцоў заснаваны з чыгуначнікаў, афіцэры па-за вайсковай падрыхтоўкі перацягваюць атрады стральцоў у афіцыйную арганізацыю па-за вайсковай падрыхтоўкі і г. д.

„Стралец“ патрабуе згрупаваць усю працу па-за вайсковае падрыхтоўкі ў руках стралковага саюзу, як піянэра гэтае справы. «Хоць і існуе дзяржаўнае кіраўніцтва па-за вайсковай падрыхтоўкі, аднак, для посьпеху справы, павінна ўзьнікнуць яшчэ адна ўсеагульная грамадзкая арганізацыя па-за вайсковай падрыхтоўкі насельніцтва. Інакш,—пагражае „Стралец“,—наш стралковы саюз павінен шукаць новых шляхоў для выхаду“.

Новыя мыты

ВАРШАВА, 31-8. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: „Эканамічная рада польскага ўраду ўхваліла скасаваць 1-га верасьня мыту на вываз пшаніцы. Адначасна павялічваецца мыта на прывоз жыта і мукі да 15-ці з паловаю злотых за 100 кілё.

Прачніся, вялікая Нямеччына!

БЭРЛІН, 1-9. Агенства Вольфа паведамляе: 1-га верасьня а 4 гадзіне ў будынку рэйхстагу пачуўся выбух, які быў чуцен вельмі здалёка. Месца здарэньня зараз-жа абкружыла паліцыя. Сілай выбуху разьбіты шыбы ў сутарэньні і ў першым паверху будынку рэйхстагу. На трамвайным слупе на вышыні ачага выбуху (на тратуары) была выяўлена так званая наклейная марка з надпісам: «прачніся, вялікая Нямеччына».

Англа-французская антанта „жыве“.

Спатканьне Брыяна з Макданальдам.

ПАРЫЖ, 2-9. У сувязі з заявамі Гендэрсона ў Гаазе і заявамі Макданальда, зробленымі ім у часе паездкі ў Парыж, а таксама ў сувязі з спатканьнем паміж Брыянам і Макданальдам, увесь французскі друк абгаварвае англа-французскія адносіны.

„Тан“ зазначае, што заявы Гендэрсона і Макданальда сьведчаць аб тым, што ўрад рабочай партыі зьвярнуўся назад у бок англа-французскай антанты, неабходнасьць якой так ясна прызнаваў Чэмбэрлен.

«ПРЫНЦЫПОВАЯ» ЗГОДА.

ПАРЫЖ, 2-9. Адбылося спатканьне паміж Брыянам і Макданальдам. Водлуг вестак «Папюлер» (орган сацыялістаў), за час гутаркі была дасягнута прынцыповая згода па пытаньні аб марскім разброеньні, а таксама па пытаньні аб супольных дзеяньнях Англіі і Францыі ў мэтах «падтрыманьня парадку» ў Палестыне і ў Сірыі.

Нямеччына спадзяецца „дзейнічаць“.

ПАРЫЖ, 2-9. Бэрлінскі карэспандэнт «Матэн» паведамляе, што адказныя нямецкія палітычныя колы схільны скарыстаць ліквідацыю англа-французскай антанты дзеля таго, каб распачаць вонкавую палітыку, якая да гэтага часу паралізавалася на ўсіх міжнародных канфэрэнцыях магутнасьцю Францыі.

Водлуг слоў карэспандэнта, у нямецкіх адказных колах лічуць неабходным англа-нямецкае зьбліжэньне.

У Саюзе ССР.

ДАГОНІМ І ПЕРАГОНІМ.

МАСКВА, 2-IX. На таварыскім абедзе, у сувязі з выпускам чырвоных камандзіраў, у парку культуры і адпачынку, выпускнікоў вітаў ад СНК СССР тав. Рыкаў. Чырвоная армія,— казаў тав. Рыкаў,—гэта ня толькі армія. Гэта будаўнік сацыялізму, барацьбіт за сацыялістычнае вобчаства, сацыялістычны ўзброены атрад.

Чырвоная армія зьяўляецца адным з рашаючых фактараў у барацьбе за камуністычны лад і таму павінна быць найбольш дасканалая. На вас, таварышы, выпускнікі, якім прыдзецца непасрэдна кіраваць самой чырвонаармейскай масай, кладуцца вялізарныя задачы. З вашай дапамогай мы павінны, таксама, як ва ўсіх галінах нашага будаўніцтва, дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны і адносна баявой падрыхтоўкі.

Вам, якія пазналі ў школах усе апошнія дасягненьні ў галіне вайсковага мастацтва, трэба ня спыняцца на гэтым. Перадаючы свае веды чырвонаармейцам, вы самі павінны рабіцца больш дасканалымі, павінны сачыць за прагрэсам у вайсковай навуцы. Трэба, каб ніводнае дасягненьне не прайшло міма вас. Калі гэта будзе выканана, дык недалёка той час, калі адносна баявой магутнасьці нашай арміі, мы дагонім і перагонім суседнія краіны.

Польская рабочая дэлегацыя ў Ленінградзе.

ЛЕНІНГРАД. 2-IX. У Ленінград прыехала польская рабочая дэлегацыя ў складзе 41-га чалавека. Дзеля спатканьня на Кастрычнікавым вакзале сабралася некалькі тысяч рабочых і работніц і камсамольскія, і піянерскія атрады.

На вакзале адбыўся мітынг. Адказваў на прывітаньні тав. Ланцуцкі, якому наладзілі бурную авацыю.

Інтэрнацыянальны вечар.

МАСКВА, 30-8. Вялікі тэатр парку Культуры і Адпачынку перапоўнен. 3 тысячы камсамольцаў Масквы сабраліся ўчора на інтэрнацыянальны вечар, прысьвечаны Міжнароднаму Юнацкаму Дню. У прэзыдыуме сходу—чужаземныя камсамольцы.

Шчыра спаткаў сход прадстаўніка нямецкага Юнгфронту т. Энпа. Пасьля прывітаньняў, пад гукі аркестру на сцэне тэатру стройнымі шарэнгамі з дзесяткамі сьцягоў выстрайваецца першы маскоўскі інтэрнацыянальны атрад камсамольцаў. Нарэшце сход заслухаў паведамленьне аб працэсе гастонскіх тэкстыльшчыкаў. Сход ухваліў рэзалюцыю, у якой пасылае шчырае прывітаньне адважным гастонскім пралетарыям. Сход патрабуе неадкладнага вызваленьня 14-ці гастонскіх вязьняў.

Вырваць з капцюроў лепшых барацьбітоў.

АРЦЁМАЎСК, 2-9. Ва ўсіх прадпрыёмствах і ўстановах адбыліся шматлюдныя мітынгі пратэсту супроць расправы над гастонскімі тэкстыльшчыкамі, якія рыхтуюцца ў Поўночна Амэрыканскіх Злучаных Штатах.

Рабочыя заклікаюць пралетарыят усяго сьвету стаць на абарону лепшых байцоў рэвалюцыйнае клясы Амэрыкі і вырваць іх з капцюроў сьмерці.

Камсамольцы засноўваюць узорную сельска-гаспадарчую камуну.

АРЦЁМАЎСК, 30-8. Да 15-га Міжнароднага Юнацкага дню камсамольцы Арцёмаўску засноўваюць узорную сельска-гаспадарчую камуну „Гігант“ на абшары ў 6 тысяч гэктараў. У камуну ўвойдзе 500 камсамольцаў, у тым ліку ўсе бюро Арцёмаўскага райкому ЛКСМ, батракі і маладыя кваліфікаваныя рабочыя Арцёмаўскай акругі.

Сьцяг СССР разьвіваецца над 80 паралельлю.

ЛЁДАКОЛ „СЕДАЎ“, 31-8. Усе будаўнічыя працы ў бухце „Ціхая“ скончаны. Пушчана радыё-станцыя з мысу Седова, якая працуе на хвалі ў 43 мэтры.

На другі дзень адбыўся ўрачысты ўздым сьцягу на штоке галоўнага дома, а ўвечары «Седаў» пакінуў бухту «Ціхую», і сам накіраваўся на поўдзень.

* * *

ЛЁДАКОЛ „СЕДОЎ“, 2-9. Адбыўся разьвітальны мітынг, на якім выступалі т. т. Шмідт, Самайловіч, Візэ і начальнік пасяленьня Ільляшэвіч. Уздым сьцягу прадаўжаўся трохкратным салютам. Пасьля разьвітаньня з тымі якія застаюцца, „Седоў“ пашоў пад салютныя гудкі. 3-га жніўня радыё-апаратар Крэнкель першы пачуў амэрыканскія станцыі, а пасьля радыё-аматара з Ніжняга Ноўгараду Яўсеева.

Мы паставілі навуковую станцыю на самым паўночным пункце нашага сэктару і гэтым ня толькі моцна пасунулі ўперад вывучэньне артыкі, але і фактычна замацавалі прыналежнасьць гэтых замель за СССР. Сьцяг СССР разьвіваецца над 80 паралельлю. СССР стаў крэпкай нагой на зямлі Франца Іосіфа.

Аднаčасна нашай экспэдыцыі ўдалося зрабіць шмат розных каштоўных наглядаў і далёка пашырыць межы, да якіх да гэтага часу плавалі савецкія суды.

Сусьветны рэкорд на паўночнай шыраце Эўропы і Азіі зараз прыналежыць нашаму флёту.

Тав. Візэ ў гутарцы з карэспандэнтам ТАСС заявіў наступнае: „Галоўная задача экспэдыцыі—устаноўка мэтэаралёгічнай радыё-станцыі выканана пасьпяхова ў тэрмін. Гэта гаворыць, што тэхнічная магчымасьць у галіне палярнай навігацыі і палярных досьледаў стаяць на вельмі вялікай вышыні і што мы вытрымалі сур'ёзны экзамен“.

Тав. Самайловіч заявіў карэспандэнту ТАСС наступнае: Зямля Франца Іосіфа да гэтага часу лічылася найменш прыступнай палярнай вобласьцю. Таму дасягненьне архіпэлягу ў кароткі тэрмін ужо зьяўляецца вельмі паказальным і ўпэўнівае аб добрым марскім складзе экспэдыцыі.

Нам удалася магчымасьць навігацыі ў Брытанскім канале, прычым мы ня толькі наведалі паўночную высшу архіпэлягу—зямлю Рудольфа, але дасягнулі таксама рэкорду шыраты.

ПЕРАМОГА СНОУДЭНА

Буржуазная Англія шуміць. Шуміць так, як ня шумела ўжо даўно. «Патрыятычныя» пачуцьці падагрэты амаль да такога-ж градусу, як у часе англа-бурскай вайны, ці ў часе асабліва вострых момантаў сусьветнае вайны 1914-1918 г. г. Праўда, зараз ніякай вайны на адкрытым полі бойкі Англія не вядзе. Але бясспрэчна тая вайна, якую Сноудэн вёў у Гаазе, мае для ангельскага капіталу вельмі вялікае значэньне, і гэта ў дастатковай меры тлумачыць цяперашні ўздым нацыяналістычных настрояў у лягеры ангельскай буржуазіі.

Гэрой вайны—зразумела Сноудэн. Сапраўды можна сказаць, што ён зараз самы папулярны чалавек у ангельскіх буржуазных колах, і яго лаўрам бясспрэчна могуць пазаздросьціць ранейшыя гэроі ангельскага імпэрыялізму—Лёйд-Джордж, Чэрчыль, Чэмбэрлен і г. д. Палітыка Сноудэна ў Гаазе, з аднаго боку, распаліла нацыяналістычныя настроі ў Англіі, а з другога, была скарыстана ім, як падтрыманьнем для сябе ў Гаазе.

Толькі правыя французскія газэты, раззлаваныя вынікамі гаагскай канфэрэнцыі, адхіляюць, што Сноудэн атрымаў у Гаазе перамогу. Ніхто іншы ў яго перамозе ня сумняваецца. Рукамі Сноудэна ангельскі капітал дабіўся вельмі сур'ёзных посьпехаў у Гаазе.

Справа, зразумела, ня ў тых фінансавых уступках, на якія прымушаны былі пайсьці іншыя дзяржавы. Гэтыя ўступкі даюць, праўда, Англіі новых 2 мільёны фунтаў стэрлінгаў у год; яны забясьпечваюць таксама ангельскую долю рэпарацый, адносячы яе на кошт, так званае бязумоўнае часткі рэпарацыйных плацяжоў. Разам з тым, Сноудэн дабіўся, на славу ангельскіх вугляпрамысловоцаў, найбольш істотнага абмежаваньня рэпарацыйных паставак натураю; у прыватнасьці, Італія абавязвалася, увамен „бясплатнага“ нямецкага рэпарацыйнага вугалю, вовзіць штогодна мільён тон вугалю з Англіі. Але ўсе гэтыя ўступкі зроблены амаль выключна за кошт Нямеччыны. Калі-б у гэтым быў увесь сэнс перамогі Сноудэна, дык наўрад ці ангельская буржуазія ўсклала-б на яго галаву такі пышны лаўравы вянок, як зараз.

Перамога-ж над Нямеччынай дэецца зараз вельмі танна. Чым больш нямецкі капітал стараецца праводзіць палітыку „зьбліжэньня з заходня-эўрапэйскімі дзяржавамі“, тым лягчэй гэтыя дзяржавы адбіраюць у Нямеччыны ўсё, што хочуць, не даючы ёй нічога ўзамену. Не ў перамозе над Нямеччынай галоўнае значэньне гаагскага посьпеху Сноудэна, а ў перамозе над тымі ўзамі, якія ў апошні час скоўвалі волю ангельскага імпэрыялізму ў яго эўрапэйскай палітыцы.

Пасьля сусьветнае вайны палітыка ангельскага імпэрыялізму ў Эўропе ў значнай меры вызначалася імкненьнем дзейнічаць у згодзе з Францыяй. За апошнія 10 год англа-французскія ўзаемаадносіны прайшлі праз некалькі стадый; імкненьне да англа-французскае згоды адзначалася то больш слаба, то мацней. Але яно адзначалася ўвесь час і дасягнула свайго найвышэйшага пункту ў мінулагодняй англа-французскай згодзе (гэтак званым „марскім кампрамісе“). Кіруючыя дзеячы ангельскага імпэрыялізму лічылі, што можна часткова прынесьці ў ахвяру свабоду дзеяньняў на эўрапэйскім сухазем'і, каб затое поўнасьцю разьвязаць сабе рукі ў каленіяльных і паўкаленіяльных краінах, а таксама для таго, каб забясьпечыць сабе падтрыманьне Францыі на выпадак канфлікту са Злучанымі Штатамі.

У Гаазе Сноудэн рашуча парваў з такою палітыкаю. Сэнс той пазіцыі, якую ён заняў на гаагскай канфэрэнцыі, ён сам фармуляваў у наступных словах: „Мінуў той час, калі Англія ішла на ўступкі. Англія ізноў павінна заняць сваё месца ў сьвеце“. Гэта азначала, што ангельскі імпэрыялізм хоча на будучы час ажыцьцяўляць свае мэты поўнасьцю, нічога ня прыносячы ў ахвяру і ня плоцячы нічога за свае пляны і намеры. Іншымі словамі, Сноудэн абвясьціў новы зварот Англіі да рэзкае наступальнае палітыкі, якая, у выпадку патрэбы, ня зьлітуецца нават над сваімі „сардэчнымі прыяцелямі“. Гэта—менавіта тая палітыка, у якой ангельскі капітал, церпячы з усіх бакоў вялікія цяжкасьці, разьлічвае знайсьці выхад з перажываемага ім крызісу. Вось чаму, Сноудэн атрымлівае такія аплёдысмэнты, вось чаму яго гаагская палітыка выклікала выбух буржуазнага нацыяналізму ў Англіі.

Можа „цьвёрдасьць Сноудэна“ не прывяла-б да такіх яскравых вынікаў, калі-б справа абмяжоўвалася толькі спрэчкамі з Нямеччынай або Францыяй. Але абвешчаная Сноудэнам палітыка мае на ўвазе ня толькі эўрапэйскія краіны. Яна цэліць таксама і супроць самага магутнага з супраціўнікаў і ворагаў ангельскага імпэрыялізму, г. зн. супроць Злучаных Штатаў. У кастрычніку маюць адбыцца перамовы аб абмежаваньні марскіх узбраеньняў, г. зн. па пытаньню, ад вырашэньня якога ў значнай меры залежаць суадносіны вайсковай магутнасьці Англіі і Злучаных Штатаў.

Яшчэ раней пачнуцца, мабыць, перамовы аб банку міжнародных разрахункаў, а з гэтым банкам шчыльна зьвязана пытаньне аб фінансавай магутнасьці дзяржаў, якія будуць удзельнічаць у кіраўніцтве яго апэрацыямі. Словам, уперадзе барацьба па двух важнейшых напрамках: з-за зброі і з-за грошай.

Выбух нацыяналізму ў Англіі—псыхалёгічная падрыхтоўка да гэтай барацьбы. Ангельская пазіцыя пры надыходзячых перамовах у значнай меры будзе вызначацца тою «грамадзкаю думкаю», якая падагрэта вынікамі гаагскай канфэрэнцыі. Гэта «грамадзкая думка» будзе для ўраду Макдональда апораю, а таксама тым довадам, на якім яна будзе спасылацца. Не падлягае таксама сумненьню, што цяперашнія настроі ангельскай буржуазіі зробяць пэўнае ўражаньне на другі бок, г. зн. на Злучаныя Штаты. Недарма, пагэтаму, у многіх колах гавораць, што Гаага была толькі рэпэтыцыяй будучай больш сур'ёзнай барацьбы па значна больш важнаму пытаньню.

Застаецца адзначыць яшчэ адзін надзвычайна характэрны момант. Выказчыкамі і падбухторшчыкамі ваяўнічага ангельскага нацыяналізму аказаліся прадстаўнікі рабочае партыі. Ангельскія рэфармісты, якія спрабуюць гаварыць ад імя рабочае клясы, на справе баранілі і бароняць самыя крайнія патрабаваньні капіталу з непараўнаўча большым імкненьнем, чымся яго афіцыйныя прадстаўнікі. Ангельскія буржуазныя газэты, захліпаліся ад захапленьня, пісалі, што «Сноудэн бараніў нацыянальныя інтарэсы больш цьвёрда, як нават Чэмбэрлен і Чэрчыль». Урад Макданальда сапраўды дазволіць, што ён служыць інтарэсам і мэтам ангельскага імпэрыялістычнага капіталу зусім ня горш, а можа нават і лепш за самых цьвёрдакаменных кансэрватараў. У гэтым сэнсе можна сказаць, што гаагская канфэрэнцыя адыгрывае такую-ж ролю, як і палітыка ўраду Макданальда ў адносіне да беспрацоўных, яго адносіны да СССР ці пядаўняе трацэйскае рашэньне па канфлікту ў баваўнянай прамысловасьці, бо палітыка Сноудэна ў Гаазе яшчэ раз з вычэрпальнаю выразнасьцю адкрыла сапраўдны твар рэфармізму.

А. Б.

Узмацнім тэмп падпіскі
НА 3-Ю ПАЗЫКУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

Спаборніцтва ў рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

Рабочыя заводу „Дрэваапрацовачнік" на агульным сходзе ўхвалілі выклікаць на спаборніцтва завод „Камунар" і вылучыць дэлегацыю для інфармацыі „камунарцаў" аб ходзе ў іх падпіскі.

На агульным сходзе рабочых і служачых заводу „Камунар" дэлегацыя ад «Дрэваапрацовачніка» інфармавала аб праўдзеньні падпіскі на 3-ю пазыку індустрыялізацыі. Вось што дэлегаты апавядалі:

У мінулым годзе пры рэалізацыі 2-й пазыкі прыходзілася праводзіць гутаркі ў цэху, праводзіць агульныя сходы і толькі пасьля гэтага праводзілі падпіску. У гэтым годзе зусім ня так. Выпуск 3-й пазыкі праводзіўся ў самы разгар падзей на Усходня-Кітайскай чыгунцы. Гэтыя падзеі ўзьнялі ініцыятыву і творчы энтузыязм сярод рабочых. У часе перапынку на абед быў праведзены лятучы мітынг, тут-жа абралі камісію і да канца работы мелі падпіскі на 11.000 руб. Пасьля гэтага рабочыя мэханічнага цэху падпісаліся на 100 проц. зарплаты і выклікалі іншыя цэхі. На сёньняшні дзень рабочыя «Дрэваапрацовачніка» падпісаліся на 25.725 р., што складае 107 проц. зарплаты. Паміж іншым 20 чал. яшчэ не падпісаліся. Гэта адпускнікі і часовыя рабочыя. Нарэшце дэлегацыя выказала надзею, што і „камунараўцы" інфармаваўшы рабочых „Дрэваапрацовачніка" будуць мець ня горшыя вынікі.

Якія-ж вынікі маюцца на сёньняшні дзень у „камунараўцаў"? Вось што сказаў старшыня камісіі т. Сарокін „Камунарцам" прыдзецца чырванець перад рабочымі, якія выклікалі нас на спаборніцтва і чырванець прыдзецца перадавым групам рабочых.

Рабочыя кузьні, дзе ўмовы працы значна цяжэйшыя і іншых цэхаў падпісаліся на 110,4 проц. зарплаты, але ёсьць сярод кавалёў і такія, якія яшчэ зусім не падпісаліся, ліцьцёвы цэх падпісаўся на 88,45 проц., такарны—на 96 проц., мадэльны—95 проц. зборачны—90 проц., бляшаны 105 проц падзёншчыкі—на 95 проц. і служачыя—76 проц. Як відаць на апошнім месцы стаяць служачыя, сярод якіх ёсьць і такія, якія не падпісаліся. Адмаўляюцца, што нібы ня ведалі пра падпіску. Яна была распачата яшчэ да афіцыйнага выпуску пазыкі. Адмаўленьне ад падпіскі, як гэта мела месца сярод рабочых, можна растлумачыць толькі несьвядомасьцю гэтых асоб. Частку віны можна яшчэ ўскласьці і на завком, бо пры пачатковай ініцыятыве рабочых бляшанага цэху, якія за адзін дзень далі 7.000 руб., гэтая папярэдняя падпіска адразу не ахапіла ўсе цэхі.

Па заводу „Камунар" падпіска дасягнула толькі 94 проц. зарплаты. На сваім шматлюдным сходзе перад дэлегатамі „Дрэваапрацовачніка" рабочыя пастанавілі, што недахопы ў рэалізацыі пазыкі будуць выпраўлены і ў бліжэйшыя дні яны дадуць тыя лічбы, як і рабочыя „Дрэваапрацовачніка", аб чым вылучаная дэлегацыя «Камунара» праінфармуе іх у бліжэйшы час.

Д. Маркаў.

„НЯДЗЕЛЬНІК"—У ФОНД ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ КРАІНЫ.

Сяляне і служачыя **Кукуевіцкага с.-с., Калінкавіцкага раёну,** Мазырскай акругі наладзілі „нядзельнік". Зароблены грошы 54 рублі перадаюць у фонд індустрыялізацыі краіны і выклікаюць пайсьці за іх прыкладам усе сельсаветы Калінкавіцкага раёну.

* * *

Падпіска на 3 пазыку ў Жыткавіцкім раёне праходзіць пасьпяхова. Да гэтае пары падпіска дала 60.000 рублёў.

* * *

Сяляне вёскі **В.-Крушынаўкі, Рагачэўскага раёну** падпісаліся на 3 пазыку на 250 рублёў і пастанавілі, каб ня было аніводнага двара бяз аблігацыі 3 пазыкі.

* * *

Сяляне вёскі Смульнае ў ліку 27 гаспадароў падпісаліся на 3 пазыку на 70 рублёў.

* * *

Рабочыя савгасу **„Слабада", Мазырскае акругі** падпісаліся на 3 пазыку на 200 рублёў. Падпіска прадаўжаецца.

* * *

У №-скім пяхотным палку чырвонаараейцы з камскладам падпісаліся на 3 пазыку на 13.000 рублёў.

Выклік прымаем.

Асьветнікі г. Рагачову выклікалі асьветнікаў г. Слуцку на спаборніцтва па падпісцы на III пазыку індустрыялізацыі. Асьветнікі Слуцку выклік прынялі і ўхвалілі ўсім падпісацца на III пазыку ў такім разьліку: хто атрымлівае да ста рублёў—падпісваецца на 100 проц. атрымліваемай пэнсіі, ад 100 да 150—на 150 проц. і ад 150—200—на 200 проц. атрымліваемай пэнсіі.

Падпіска па ўсіх установах праводзіцца, і ўсе асьветнікі падпісваюцца на пазыку. Можна спадзявацца, што ніводнага асьветніка ня будзе без аблігацыі III пазыкі. Кацярыніч.

Аблігацыю ў кожны двор.
(Рагачэўскі р., Бабруйшчына).

По вёсках р-ну праводзіцца цяпер шырокая растлумачальная праца аб значэньні падпіскі сялянства на III пазыку індустрыялізацыі. Дзеля гэтай мэты выдзелены ўпаўнаважаныя райвыканкому, якія праводзяць спэцыяльныя сходы сялян у мэтах растлумачэньня падпіскі. Некаторыя сельсаветы ўступаюць у спаборніцтва па падпісцы на III пазыку.

Кулакі агітуюць супроць пазыкі, але бедната заявіла, што ў адказ кітайскім бандытам яна падпісваецца на пазыку, ганьбіць той двор, які ня будзе мець аблігацыю III пазыкі. Я КР.

Завод даў 7300 руб.

На дражджавым заводзе „Пралетары" падпіска на 3 пазыку індустрыялізацыі скончана. Падпіскай ахоплены ўсе рабочыя і служачыя заводу. Трэба адзначыць, што падпіска прайшла з вялікім уздымам. Шмат рабочых падпісаліся больш, як на 100 проц.

Маладыя камандзіры падпісваюцца на пазыку.

Курсанты №-скай палкавой школы падпісаліся на 3 пазыку на суму 2.220 рублёў.

— Няхай памятаюць, — гаворыцца ў рэзалюцыі, курсантаў школы,—міжнародныя капіталісты, што Чырвоная армія можа ня толькі стаяць на варце заваёў Кастрычніка, але сумесна з рабочымі і сялянамі будуе ў сваёй краіне сацыялізм.

Выклікаем камуны.

Камунары камуны «Хлеб і Воля» Дрыбінскага раёну, Аршанскае акругі падпісаліся на 3 пазыку індустрыялізацыі на суму 430 рублёў і выклікаюць зрабіць па іх прыкладу наступныя камуны: «Майскі Дзень», „Расьсьвет", „Пахарь" і «Чырвоны Кастрычнік".

За грамату, за сацыялістычную культуру.

Усе ў шэрагі т-ва „Прэч няпісьменнасьць".

Да ўсіх рабочых і сялян, да ўсіх камсамольцаў і працоўнай інтэлігенцыі.

На ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва кіпіць творчая энэргія рабочае клясы.

Ідзе нябывалая ў гісторыі чалавецтва вялізарная сацыялістычная перабудова ўсяе народнае гаспадаркі, але-ж сотні тысяч няпісьменных БССР зьяўляюцца вялізарнай перашкодай на шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

ЦК УсеКП(б) і КПБ вынесьлі адпаведныя пастановы па пытаньнях ліквідацыі няпісьменнасьці. Партыя лічыць барацьбу з няпісьменнасьцю надзвычайна важнай і палітычнай задачай.

Бяз ліквідацыі няпісьменнасьці нельга прыцягнуць шырокія колы працоўных да актыўнага ўдзелу ў дзяржаўным кіраўніцтве і сацыялістычным будаўніцтве.

Цемра, рэлігія, хуліганства, п'янства і нацыянальная варожасьць ідуць нага ў нагу, складаючы адзіны антысавецкі фронт разам з кулаком, нэпманам і зарубежнай буржуазіяй. Яны выкарыстоўваюць цемру ў сваіх мэтах.

Масавая барацьба за сацыялістычную культуру і пісьменнасьць сярод сотні тысяч працоўных,—перамога на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, удар па контр-рэвалюцыйнаму фронту.

„Сацыялізм жывы—ёсьць справа рук саміх працоўных", пісаў Ленін, а там, дзе за справу ўзяліся масы,—посьпех забясьпечаны.

Пісьменнасьць ня толькі дапаможа выявіць бюракрата, яна дасьць магчымасьць замяніць дрэннага чыноўніка вылучэнцам з шэрагу рабочых і сялян.

Пісьменнасьць і тэхнічныя веды дапамогуць рэканструкцыі нашай вытворчасьці, уздымуць вытворчасьць працы, палепшаць якасьць прадукцыі і тым самым будзе зьменшаны сабекошт, дасьць магчымасьць вылучыць новыя сотні чырвоных камандзіраў у прамысловасьці і сельскай гаспадарцы.

Таварышы рабочыя і сяляне, работніцы і сялянкі арганізуйце тысячы пісьменных на барацьбу з бязкультур'ем і цемрай. Усе ў шэрагі таварыства „Прэч няпісьменнасьць".

Усебеларуская нарада па ліквідацыі няпісьменнасьці намеціла шэраг практычных мерапрыемстваў у напрамку зьнішчэньня тых недарэчнасьцяў, якія былі ў мінулым годзе.

Народны Камісарыят Асьветы, таварыства „Прэч няпісьменнасьць", камсамол і прафэсыянальныя саюзы—галоўныя штурмачы культурнага паходу.

Да 13-й гадавіны Кастрычніка не павінна быць ніводнага няпісьменнага рабочага, ніводнага няпісьменнага калгасьніка, савгасьніка, жанчыны-дэлегаткі, батрака і дапрызыўніка.

Перад намі стаіць задача навучыць грамаце ў гэты навучальны год 258 тысяч, з іх, сіламі грамадзкіх арганізацый, 70 тысяч.

Арганізуем-жа масавы рух за грамату і сацыялістычную культуру.

Рабочыя і работніцы, камсамольцы, сельскія актывісты, працаўнікі асьветы, савецкая інтэлігенцыя, пралетарскае студэнцтва, школьнікі і піянэры—уступайце ў культурны паход супроць няпісьменнасьці і цемры.

Арганізуйце школы для малапісьменных, лікпункты для няпісьменых, індывідуальнае групавое навучаньне.

Аб'яднайце барацьбу з няпісьменнасьцю шырокай палітыка-асьветнай і грамадзка-карыснай работай. Утварайце лекцыі, масавыя сходы, паказальныя экскурсіі на заводы, калектывы, савгасы.

Арганізуйце сацыялістычнае спаборніцтва за грамату, за сацыялістычную культуру.

Няхай кожнае прадпрыёмства, кожная школа і ВУЗ, кожны савгас і калгас, кожны клюб і хата-чытальня, кожнае жылтаварыства і каапэратыў стануць асяродкам месячніка „За грамату", уцягваючы ў навучаньне і палітыка-асьветную працу ўсё акаляючае неарганізаванае насельніцтва.

Арганізуйце ў кожным жакце, калгасе, савгасе і вёсцы лікпункты і бібліатэкі.

Бяз кніжкі грамата забываецца. Пісьменны рабочы і селянін нясі газэту і кніжку ў шэрагі малапісьменнага насельніцтва. Газэта, кніжка і брашура павінны стаць даступным рабочаму, батраку і бедняку-селяніну.

Арганізуйце збор кніжак, газэт, арганізуйце бібліатэкі-перасоўкі для малапісьменных, уносіце сваіх кніжак для ўтварэньня перасовак.

У вёсцы не навучаліся чытаць і пісаць таму, што нехапала лемантароў і сшыткаў. Арганізуйце збор лемантароў і сшыткаў.

Кожны пісьменны спытай сам сябе, што ты зрабіў для справы ліквідацыі няпісьменных.

Памятай, што няпісьменнасьць—тормаз сацыялістычнага будаўніцтва, што барацьба за грамату—клясавая барацьба, што індустрыялізацыя краіны, падняцьце ўраджайнасьці залежыць ад удзелу тысячы пісьменных у барацьбе за культуру, за граматнасьць.

Усе ў атаку на няпісьменнасьць, усе ў шэрагі т-ва „Прэч няпісьменнасьць". Прафэсыйная грамадзкасьць і навуковыя арганізацыі мабілізуйце ўсе свае сілы, усе свае сродкі і ўвагу на барацьбу з няпісьменнасьцю.

Камсамольцы, студэнты і школьнікі—у першыя шэрагі барацьбітоў за грамату.

Адзіным фронтам, пад кіраўніцтвам Камуністычнай Партыі,усе на барацьбу за грамату, за сацыялістычную культуру.

Ц. Савет Т-ва „Прэч няпісьменнасьць".
ЦК ЛКСМБ. ЦСПСБ. НКА Беларусі.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.
(Ад нашых карэспандэнтаў).

Чырвоныя абозы з хлебам.
(Магілеўшчына).

Працоўнае сялянства Клімавіцкага раёну адказала на выбрыкі кітайскіх імпэрыялістаў арганізацыяй першых у акрузе чырвоных абозаў новага збожжа. Гэтымі днямі ў г. Клімавічы прыбыў абоз арганізаваны калгасамі. Здадзена розных хлебапрадуктаў 2.500 п. Буйнейшы калгас „Ленінскі Шлях" здаў 1000 пудоў. Нова-ўтвораны калгас „Камунар Магілеўшчыны" здаў 500 п. Рэшту здалі калгасы: „Энэргія", „Карпачы", „Навінка", „Усход" і вёска Камахоўка, якая ў сучасны момант таксама арганізуе калектыў.

Абоз прыбыў пад чырвоным сьцягам з плякатамі. Як толькі прыбыў чырвоны абоз—быў арганізаваны лятучы мітынг, на якім з прамовамі выступалі калгасьнікі. Яны там-жа заявілі, што адлічаюць паўдзённы і аднадзённы заробак на арганізацыю трактарнае калёны. Збор сродкаў на ўтварэньне трактарнае калёны распачаўся і па вёсках Клімаўшчыны.

Калгасьнікі ў сваіх прамовах на мітынгу запэўнілі працоўных у тым, што яны з усёй энэргіяй, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі ўзяліся за будаўніцтва новага жыцьця і што яны, у шчыльным саюзе з рабочай клясай, паставяць вёску на сапраўды-ленінскі, сьветлы шлях. Л-ны.

„За намі бедняк і серадняк".

25 жніўня адбылася першая калектыўная здача лішкаў хлебапрадуктаў у загатоўчыя органы калгасамі і с-г. арцелямі Рагачоўскага р-ну. Гэты дзень калектыўнай здачы хлеба быў сапраўды вялікім сьвятам працоўных горада і вёскі. Каб сустрэць чырвоныя абозы з хлебам, райпрафбюро саюзаў наладзіла сустрэчу ўсімі саюзамі, асабліва чынны ўдзел у гэтым прыняў саюз працасьветы, у якога адбывалася канфэрэнцыя. Першы абоз, які сустрэлі гэта быў калгасу „Ніва", Дварэцкага с-савету які прывёз усе свае лішкі, за гэтым калгасам пасьледавала бедната пасёлкаў Бароўкі, Малінаўшчына і Чырвоны Востраў, якая таксама сабрала лішкі хлеба ў ліку 70 пудоў і здала сумесна з калгасам.

Барсукоўская школа таксама прывезла 25 пуд. На хурманках неарганізаванага сялянства плякат; „ЗА НАМІ БЕДНАТА І СЕРАДНЯКІ".—Гэты плякат заклікае рэшту сялянства пасьледаваць прыкладу бедната гэтых пасёлкаў. Далей пацягнуліся чырвоныя абозы камуны „Іскра", арцелі Аннаўка, яўрэйскай арцелі „Кін" і „Гіганта", Рагачэўскага раёну калгас Сьвержынскага с-савету, які прывёз хлеба на 15 фурманках. Тут-жа быў праведзен кароткі мітынг і дэманстрацыя ў азнаку салідарнасьці рабочай клясы і сялянства. Усяго за дзень здадзена чырвонымі абозамі да 1000 пуд. хлеба ў сельска-гаспадарчую каапэрацыю. Я. М. САВІЦКІ.

Камсамольцы гатовы выступіць у бой.

Полацак, 3-IX. Сьвяткаваньне Міжнароднага Юнацкага Дню на Полаччыне прайшло з вялікім уздымам працоўнай моладзі. 31 жніўня ўвечары адбыўся гарадзкі зьлёт піянэраў, затым кустовыя сходы камсамольскіх ячэек, на якіх стаяла і займала належнае месца пытаньне адносна абароназдольнасьці савецкай краіны, у сувязі з апошнімі падзеямі на Кіт-Усх. мяжы, у сувязі з бандыцкімі нападамі на савецкі саюз.

Агульнае ўражаньне ад кустовых сходаў: камсамольцы зьвяртаюць вялікую ўвагу на абароназдольнасьць СССР. Была ўтворана запіс дабраахвотнікаў у Далёка-Усходнюю армію, у час якой запісалася каля 200 асоб у тым ліку і беспартыйнай моладзі. У выступленьнях можна было пачуць наступныя словы: „чакаем загаду тав. Варашылава", „гатовы выступіць у бой па першаму закліку партыі" і інш.

На другі дзень увечары адбылася агульна-гарадзкая дэманстрацыя камсамольцаў і рабочай моладзі, пасьля якой быў вялікі мітынг. У рэзалюцыі гаворыцца, што камсамолія Полаччыны па першаму закліку можа выступіць у бой, на абарону бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету—СССР. З такім-жа ўздымам адбылося сьвяткаваньне і ў раёнах на вёсцы,

Папаўняюцца сьпісы дабраахвотнікаў у Далёка-Усходнюю армію.

Прадуктамі будзем забясьпечаны.

Барысаў, 3-9. Праўленьнем ЦРК і аддзяленьнем Белкаапсаюзу прыняты крокі да загатоўкі і здавальненьня насельніцтва гораду сельска-гаспадарчымі прадуктамі.

Закуплена 8 вагонаў агуркоў, загатавана будзе квашанай капусты 9-10 вагонаў. Намечана загатовіць бульбы 80.000 п., буракоў—3000 пуд., цыбулі—2.000 пуд. і інш. прадуктаў.

У гэтым загатовачным сэзоне, у сувязі з павялічэньнем колькасьці загатовак, назіраецца вялікі недахоп у складачных памяшканьнях. У выпадку несваечасовай падрыхтоўкі складачных памяшканьняў для хаваньня сельска-гаспад. прадуктаў —магчыма кампанія будзе сарвана.

Камгасу трэба тэрмінова паклапаціцца наконт гэтага.

Паміж іншым трэба зазначыць, што ў арганізацый, якія вядуць загатоўку сельска-гаспадарчых прадуктаў па Барысаўшчыне, няма сталых плянаў, што пагражае зрывам гэтай кампаніі.

Ход пабудовы макароннай фабрыкі.

Барысаў, 3-IX. Шпаркім тэмпам праходзяць будаўнічыя працы па пабудове макароннай фабрыкі.

Фабрыка гэта будзе з'яўляцца самай буйнай прамысловай адзінкай.

Каштоўнасьць усіх работ складае прыблізна да 400.000 руб.

Па каляндарнаму пляну ў гэтым сезоне павінны быць скончаны ўсе рамонтна-будаўнічыя работы, каштоўнасьць якіх складае 75.000 р.

Ход будаўніцтва ідзе нармальна. Наглядаліся ў першы час недахопы ў будаўнічым матэрыяле, але паступова гэты недахват зьнішчаны.

На будаўніцтве занята 88 рабочых. Маецца недахоп у кваліфікаванай рабочай сіле, з прычыны чаго прыходзіцца працаваць звышчасова і ў дні адпачынку.

Будаўнічымі арганізацыямі прыняты шэраг мерапрыемств да зьніжэньня кошту будаўніцтва, шляхам упрашчэньня канструкцыі.

Сацыялістычнае спаборніцтва на будаўніцтве праходзіць слаба.

ШПІЁНАЖ ПОЛЬШЧЫ
на тэрыторыі СССР.

Сёньня ў гор. Менску Трыбунал Беларускае Ваеннае Акругі слухае заслугоўваючую сур'ёзнае грамадзкае ўвагі справу польскага перапраўшчыка **Шмідта** і польскага агента **Янкоўскага-Мохава.**

Па гэтай справе прадстане перад судом, як афіцыйная асоба польскай пагранічнай ахраны, камэндант Дзісьненскай стражніцы КАП (корпусу ахраны пагранічнай Польшчы), затрыманы па савецкай тэрыторыі ў той момант, калі ён, пераправіўшы праз граніцу польскага шпіёна, паказваў яму далейшы шлях. Затрыманы ў форме польскага пагранічніка разам з **Шмідтам** назваў сябе польскім салдатам **Янкоўскім**, аднак цэлы шэраг фактычных даных, выяўленых як у **Шмідта**, так і ў Янкоўскага, сьведчылі аб іх сапраўднай мэце зьяўленьня на тэрыторыю СССР у такім нязвычайным месцы і часе, г. зн, з мэтай шпіёнажу.

Для савецкай грамадзкасьці добра вядомы гэтыя тыпічныя прадстаўнікі быўшых людзей, якім зьяўляецца Янкоўскі-Мохаў і які скаціўся да становішча платных агентаў чужаземных разьведак. З гэтае прычыны ў данным працэсе больш характэрнай і заслугоўваючай нашае ўвагі зьяўляецца роля камэнданта Дзісьненскай стражніцы **Шмідта**, які зьяўляецца афіцыйнай асобай польскай пагранічнай ахраны і які ў парадку загадаў выконваў ролю перапраўшчыка польскай разьведкі.

Ня гледзячы на тое, што СССР з Польшчай знаходзяцца ў нармальных дружаскіх узаемаадносінах, польская разьведка праз польскую пагранічную ахрану сыстэматычна з году ў год наводняе тэрыторыю Савецкага Саюзу людзьмі, якія не адмовіліся яшчэ ад думкі актыўнай барацьбы з савецкай уладай шляхам тэрору, дывэрсій і г. д., выкарыстоўваючы іх таксама і для сваіх мэт па зборы вестак ваеннага характару.

У злачынстве **Янкоўскага-Мохава** галоўнымі памочнікамі і натхніцелямі зьяўляўся ня толькі **Шмідт**, але і шэраг асоб з вышэйшага складу польскай пагранічнай ахраны, у тым ліку і начальнік разьведкі 5-га батальёну КАП паручык **Томчак**, аб чым красамоўна сьведчаць знойдзеныя пры вобыску дакуманты.

Маючы адбыцца працэс па гэтай справе пральле яскравы сьвет на контр-рэвалюцыйную і шпіёнскую дзейнасьць афіцыйных прадстаўнікоў польскіх улад. Н З.

Беларусь будзе мець свой цэмэнт.
У РАЙЁНЕ КРЫЧАВА (МАГІЛЕЎСКАЯ АКРУГА) БУДЗЕ ПАБУДАВАНЫ ЗАВОД ПА ВЫРАБУ ЦЭМЭНТУ.

Энергічная дасьледчая праца Горнай Групы ВСНГБ выявіла магутныя завалі добраякаснай крэйды і глін для вырабу мокрым спосабам портландцэмэнту. Паказаная сыравіна залегае ў раёне Крычава, Магілеўскай акругі і распаўсюджваецца па выведаным даным на прасягу 10 кв. км. Колькаснае атрыманьне крэйдаў на гэтым мейсцы да ўрэзу вады больш мільярду пудоў, а глін, якія ідуць у вытворчасьць—больш поўмільярду (арыентыровачна).

Гэтакая колькасьць дае забясьпеку цэмэнтнаму заводу з выпускам 700.000 дзежак у год, прыблізна, на 100 гадоў.

Акрамя дасьледчай працы Горнай Групы сыравіна дасьледавана вядомым спэцыялістым па цэмэнту проф. Юнгам, якім сыравіна лічыцца высокаякаснай і ёсьць нават магчымасьць выраблядь з гэтай сыравіны цэмэнт вышэйшага сорту, які мае вялікі попыт.

Тэрытарыяльнае залеганьне сыравіны, таксама і месца пабудовы заводу знаходзіцца каля станцыі Крычава—важнага чыгуначнага вузла двох чыгунак каля ракі Сож. Такім чынам, мы маем ідэальныя транспартныя ўмовы для гэтага заводу, як у сэнсе дастаўкі матар'ялаў для пабудовы заводу, так і для перавозкі гатовага прадукту. Мясцовасьць, якая абрана для пабудовы заводу—роўная, сухая і ніякіх значных нэвеліровачных работ не прадугледжваецца. Эскізны праэкт цэмэнтнага заводу зроблен і зацьверджан Тэхсаветам Сэлікатнай Прамысловасьці.

Цяпер распрацоўваецца тэхнічны праэкт і рабочыя чэрцяжы. Праэктная праца разьлічана такім чынам, каб можна была раньняй вясной 1930 году прыступіць да пабудовы заводу. Цэмэнтны завод будзе абслугоўвацца ўласнай электрастанцыяй з 3-х агрэгатаў па 2.500 конскіх сіл, з якіх адзін агрэгат будзе запасным.

Станцыя будзе працаваць на торфу, якога ёсьць вельмі шмат у раёне Крычаў—Клімавічы. Магутнасьць станцыі запраэктыравана з такім разьлікам, каб яна акрамя заводу абслугоўвала як мясцовае насельніцтва на значнай тэрыторыі, так і прамысловасьць і асабліва калектыўныя сельскія гаспадаркі.

На заводзе на распрацоўках сыравіны будзе працаваць каля 1.000 рабочых, што зразумела, зьменіць экапамічнае становішча гэтага раёну.

Асноўная маса рабочых будзе мясцовая, а невялікая колькасьць вопытных рабочых цэмэнтнікаў будзе запрошана з другіх раёнаў, асабліва з Бранскай акругі. Агульная каштоўнасьць заводу з жыльлёвымі пабудовамі абойдзецца, прыблізна, у 7 мільёнаў рублёў, з якіх 2 мільёны на пачатак будаўніцтва ўжо ўключаны ў кантрольныя лічбы 1929-30 г. Пры заводзе будзе пабудаван рабочы пасёлак з усімі бытавымі патрэбамі. Горш абстаіць справа з вышэйтэхнічнай сілай. Інжынэраў цэмэнтнікаў у нас мала і Белбудтрэст прымушан запрасіць некаторых замежных спэцыялістаў. Некаторыя падрыхтоўчыя работы распачнуцца яшчэ ў бягучым годзе, сюды ўключаны і заказ абсталяваньня і падвоз будаўнічых матар'ялаў. Для ўвязкі ўсіх пытаньняў па пабудове цэмэнтнага заводу будзе складзены пры Стромтрэсьце спэцыяльнае кіраўніцтва ў абавязкі якога будуць уваходзіць усе пытаньні пабудовы, а таксама азнаямленьне з усімі тэхнічнымі навінамі ў цэмэнтнай вытворчасьці, як у саюзе, так і па замежамі СССР.

На ўвесь час будовы. Трэст арганізуе аўтарытэтную кансультацыю найлепшых цэмэнтнікаў. Што датычыцца абсталяваньня, трэба падкрэсьліць, што да гэтага часу яго прывазілі з-замежных краін. У сучасны момант значная частка абсталяваньня выраблецца ў саюзе і зразумела трэст максымальна будзе эканоміць валютныя сродкі. Прадугледжана пабудаваць завод у канцы 1931 году і такім чынам, да будаўнічага сэзону 1932 году Беларусь будзе ўжо мець часткова ўласны цэмэнт. Горная дасьледчая праца будзе прадоўжана, што пашырыць базу сыравіны і дасьць магчымасьць у будучым пашырыць вытворчасьць цэмэнту, так і пабудаваць там шэраг іншых прадпрыёмстваў будаўнічых матар'ялаў, якія грунтуюцца на цэмэнце, як-та: этэрніта, бэтонных вырабаў і г. д.

Улічваючы вышэйскладзенае можна з цьвёрдай упэўненасьцю сказаць, што Крычаў стане індустрыяльным раёнам Беларусі. Партыйным, савецкім і прафэсыянальным арганізацыям Магілеўшчыны наогул і Крычаву ў прыватнасьці трэба загадзя падрыхтавацца да абслугоўваньня значнае рабочае масы, якія ў бліжэйшым часе зьявіцца ў раёне Крычава.

Мар'ясін.

Д. МАНУІЛЬСКІ

БАРАЦЬБА ЗА БОЛЬШАСЬЦЬ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ.

АСНОЎНЫЯ ПЫТАНЬНІ ПАЛІТЫЧНАГА ДНЮ.

Пытаньне аб заваёве кіраўніцтва рабочым рухам ёсьць зараз «пачатак усіх пачаткаў», з якога мы павінны выходзіць пры вызначэньні ўсіх астатніх задач кампартыі. Гэта—галоўнае ўсяго далейшага ўнутрыпартыйнага разьвіцьця сэкцый Камінтэрну, вырашаючых важнейшую ва ўмовах трэцяга пэрыоду праблему набліжэньня асноўнага масыву рабочае клясы да яго авангарду і пашырэньня гэтага авангарду для пераможнай барацьбы за пралетарскую дыктатуру. Гэту задачу камуністам Эўропы і Амэрыкі прыходзіцца вырашаць у іншых умовах як расійскім бальшавіком да Кастрычнікавай рэвалюцыі 1917 году. Капіталізм у гэтых краінах мацней, буржуазія больш арганізавана, падкуп і згаршэньне вярхушак рабочае арыстакратыі такі, які ня быў і ў старой царскай Расіі, рабочая кляса там больш арганізавана ў разнастайныя жоўтыя арганізацыі (сац.-дэмакратыя, рэфармісцкія прафсаюзы, хрысьціянскія, Амэрыканская фэдэрацыя працы і г. д.).

Мы не знаходзімся яшчэ перад тварам непасрэдна рэвалюцыйнай сітуацыі, калі рэвалюцыйная партыя пралетарыяту абавязана ставіць перад сабой пытаньне ня толькі аб заваёве большасьці рабочае клясы, але і аб распаўсюджваньні свайго ўплыву на самыя шырокія пласты ўсіх наогул працоўных і эксплёатуемых. Але мы ўжо знаходзімся на такім этапе разьвіцьця мірнага камуністычнага руху, калі ў шэрагу краін з моцнымі камуністычнымі партыямі задачу заваёвы большасьці рабочае клясы мы павінны паставіць як канкрэтную задачу **сёньняшняга палітычнага дню.**

Але, ставячы перад сабой задачу заваёвы кіраўніцтва рабочым рухам, мы сутыкаемся з надзвычайнаю рознастайнасьцю ўмоў яе вырашэньня. Гэта задача стаіць у Нямеччыне інакш, чым, напрыклад, у Англіі, і зусім інакш яна ставіцца перад маленькай аўстрыйскай кампартыяй. Тут ня можа быць ні прастаты, ні адзінага агульнага шаблёну яе вырашэньня. У шэрагу краін мы, камуністы, толькі яшчэ патэнцыяльная сіла, сіла заўтрашняга дню. У іншых краінах, як, напрыклад, у некаторых краінах Лацінскай Амэрыкі, дзе адбываецца вельмі частая зьмена палітычных кан'юнктур і дзе нярэдка вельмі шпарка насьпяваюць непасрэдна рэвалюцыйныя сітуацыі, рост уплыву маладых, палітычна неабстраляных кампартый на самыя шырокія непралетарскія масы працоўных ідзе часта значна шпарчэй пашырэньня іх уплыву на рабочую клясу. У такіх каленіяльных краінах, як Індыя, дзе палітычная партыя толькі ў зародку, вялізарныя масы, мільёны людзей змагаюцца ўжо нашымі мэтадамі клясавага гвалту, ня лічачы сябе камуністамі-бальшавікамі.

Падыход да вырашэньня гэтай задачы залежыць ад агульных умоў эканамічнага, палітычнага і гістарычнага разьвіцьця рабочага руху данай краіны, ад ступені яго **рэвалюцыйнай** сьпеласьці, але ў першую чаргу ад узроўню стану камуністычнага руху. Мы ставім гэту задачу, як актуальную задачу дню, таму што мы—не маленькая сетка ў сусьветным рабочым руху. Камінтэрн—гэта ўжо ня „здань камунізму", які бродзіць па Эўропе, гэта рэальная моц, падрыхтоўваючая, арганізуючая і кіруючая сёньня клясавымі пралетарскімі бойкамі ў шэрагу краін. Не гуртковымі мэтадамі, мэтадамі толькі агітацыі і прапаганды мы будзем вырашаць гэту задачу на сучасным этапе рабочага руху, а мацнеючымі і пашыранымі клясавымі бойкамі, галоўнейшым мэтадам заваёвы большасьці рабочае клясы ў абставінах узьняцьця хвалі рабочага руху. Шляхам вырашэньня гэтай асноўнай задачы мы перабудоўваем нашы шэрагі.

Унутры кампартыі перавагу атрымліваюць найбольш актыўныя баявыя элемэнты нашага руху, здольныя ў унутрыпартыйнай палітыцы паказаць зрухі, якія адбываюцца ў рабочай клясе. Тое, што правыя называюць „крызісамі" ў Камінтэрне,—ёсьць бальшавізацыя кампартый, неабходная папярэдняя ўмова для пасьпяховага выкананьня задачы заваёвы кіруючай ролі ў рабочым руху. Гэта пераход кампартый, калі можна так сказаць, у „вышэйшую клясу" з адхіленьнем усяго нягоднага, малапасьпяховага і адстаючага ад патрэб камуністычнага руху.

ЦІ МОГУЦЬ КАМПАРТЫІ ПРЫ КАПІТАЛІЗЬМЕ АХАПІЦЬ АРГАНІЗАЦЫЙНА БОЛЬШАСЬЦЬ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ?

Што азначае заваяваць кіруючую ролю ў рабочым руху? Ці азначае гэта, што камуністы абавязаны заваяваць большасьць рабочае клясы? Ва ўмовах Эўропы пры наяўнасьці моцных сацыял-дэмакратычных рэфармісцкіх прафсаюзаў—бясспрэчна абавязаны. Але ці азначае гэта, што камуністы абавязаны **арганізацыйна** ахапляць большасьць рабочае клясы? Не, гутарка ідзе толькі аб непасрэдным уплыве кампартыі на большасьць рабочае клясы праз яе прыводныя рамяні—прафсаюзы, фабзавкомы, стачачныя камітэты, розныя камітэты дзеяньняў, якія арганізуюцца на прадпрыемствах і г. д. Благая была-б кампартыя, якая-б чакала арганізацыйнага ахапленьня большасьці рабочае клясы, каб прэтэндаваць на кіруючую ролю ў рабочым руху. Колькасна малая кампартыя, якая дала-б сябе застрашыць лічбавую колькасьцю сацыял-дэмакратычных галасоў і адмовілася-б ад барацьбы за кіраўніцтва ўжо сёнешнім рабочым рухам, паказала-б сваё нявер'е ў тое, што яна, і толькі яна, зьяўляецца **адзінаю** рабочаю партыяю. У рамках капіталізму камуністы ніколі ня стануць і ня могуць стаць „арганізаванай" большасьцю рабочае клясы.

Мы адхіляем самым рашучым чынам фашысцкія адносіны правых апартуністычных элемэнтаў да пытаньняў аб заваёве большасьці рабочае клясы. Гэтыя людзі вымяраюць суадносіны сіл паміж камуністамі і сацыял-дэмакратыяй у рабочым руху **статыстычнымі** маштабамі, якія мала чым адрозьніваюцца ад маштабаў сацыял-дэмакратычных, грунтаваных як вядома на вопыце буржуазнай дэмакратыі. Мы адхіляем фармальныя крытэрыі, таму што ў палітычна распушчанай да мозгу зьверху да нізу на сыстэме ашуканства, дзякуючы націску на працоўныя масы капіталістычнай дэмакратыі, ня можа быць ніколі поўнага, вольнага выказваньня волі рабочае клясы. Мы маем для вызначэньня заваёвы большасьці іншыя крытэрыі, а менавіта—кіраўніцтва кампартыі **масавымі бойкамі** пралетарыяту. Кампартыя можа ня мець фармальнай большасьці, і ў той-жа час кіраваць усімі важнейшымі выступленьнямі рабочае клясы.

Гэтаю пастаноўкаю пытаньня мы адзначаем таксама **легалістычнае** ўяўленьне аб заваёве большасьці рабочае клясы. Правыя апартуністычныя элемэнты ўяўляюць заваёвы большасьці рабочае клясы выключна ў рамках легальных партый, **мірным**, амаль ідылістычным спосабам, на аснове „рабочай дэмакратыі". Наша барацьба за большасьць рабочае клясы будзе ажыцьцяўляцца крывавымі бойкамі ня толькі з буржуазіяй, але і з сацыял-дэмакратыяй. Гэта пэрспэктыва палохае правых апартуністаў. У іх уяўленьні нелегальная партыя—**гэта адрыў ад мас.** Толькі тая партыя зможа сапраўды па-бальшавіцку падысьці да заваёвы большасьці рабочае клясы, якая зможа спалучаць адкрытыя формы руху з нелегальнымі формамі працы, якая хутка зможа перабудаваць свае шэрагі стасоўна да ўмоў падпольля.

ЛЕНІНСКАЯ ЎСТАНОЎКА Ў ПЫТАНЬНІ АБ ЗАВАЁВЫ БОЛЬШАСЬЦІ.

Ленінская ўстаноўка ў пытаньні аб заваёве большасьці рабочае клясы прадугледвае пазіцыю камуністаў у пытаньні аб заваёве большасьці усіх наогул працоўных і эксплёатуемых.

„Пралетарыят ня можа перамагчы, —пісаў Ленін,—не заваёўваючы на свой бок большасьці насельніцтва. Але абмяжоўваць або абумоўліваць гэту заваёву набраньнем большасьці галасоў на выбарах пры ПАНАВАНЬНІ БУРЖУАЗЕІ — ёсьць непраходная тупасьць ці простае ашуканства рабочых. Каб ЗАВАЯВАЦЬ БОЛЬШАСЬЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА НА СВОЙ БОК, пралетарыят павінен, папершае, скінуць буржуазею і захапіць дзяржаўную ўладу ў свае рукі; ён павінен, па-другое, увесьці савецкую ўладу, разьбіўшы да шчэнту стары дзяржаўны апарат, чым ён адразу падрывае панаваньне, аўтарытэт, уплыў буржуазеі і дробнабуржуазных згоднікаў сярод большасьці непралетарскіх працоўных мас. Ён павінен, па-трэцяе, ДАБІЦЬ уплыў буржуазеі і дробна-буржуазных згоднікаў сярод большасьці непралетарскіх працоўных мас РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ ажыцьцяўленьнем іх эканамічных патрэб за кошт эксплёататараў".

(Ленін. Выбары ў устаноўчы збор і дыктатура пралетарыяту. 16 сьнежня 1919 г.).

Падагулім устаноўку Леніна па гэтых асноўных пытаньнях.

Першае становішча. Для таго, каб рэвалюцыйная партыя пралетарыяту змагла скінуць буржуазею, разьбіць стары дзяржаўны апарат, стварыць новую савецкую ўладу, яна павінна заваяваць на свой бок большасьць рабочай клясы.

Другое становішча. Пралетарыят можа нізрынуць буржуазею да заваёвы на свой бок большасьці непралетарскіх працоўных мас, бо яго моц у кожнай капіталістычнай краіне значна больш за **колькасныя** адносіны да агульнай масы насельніцтва.

Трэцяе становішча. Пралетарыят пасьля нізрынуцьця буржуазеі павінен скарыстаць дзяржаўную ўладу як сродак прыцягненьня на свой бок пераважнай большасьці непралетарскіх працоўных мас, як сродак адваёвы гэтых мас у буржуазеі і дробнабуржуазных партый.

Але ленінская пастаноўка пытаньня аб заваёве большасьці рабочае клясы ніякім чынам не азначае захапленьне стыхійнасьцю руху. У нас у мінулым элемэнты рэвалюцыйнай стыхійнасьці адыгрывалі значна большую ролю, чымся ў руху заходня-эўрапэйскага пралетарыяту, вярхушка якога дзесяцігодзьдзямі сыстэматычна спакушалася ашуканствам парляманцкай дэмакратыі, вольнасьці рэфармісцкіх рабочых арганізацыяў і г. д. Гісторыя патрабуе ад нас на Захадзе больш грунтоўнай падрыхтоўкі да рэвалюцыі, чымся ў старой Расеі яшчэ і таму, што сусьветная буржуазея дасканала скарыстала вурокі паражэньня расейскай буржуазеі і абшарнікаў у кастрычніку 1917 г. Яна лепш падрыхтавана зараз да грамадзянскай вайны, чым у 1917 г. Яна зараз усюды мае моцныя фашысцкія атрады, яна перабунтавала пад відам „разбраеньня" сваю армію на клясаваму прынцыпу для мэтаў грамадзянскай вайны, яна ўдасканаліла ўвесь свой апарат прымусу.

Усе гэтыя ўмовы ставяць перад кампартыяй усіх краін задачу лепшай арганізацыйнай падрыхтоўкі рэвалюцыі, чымся гэта мела месца ў расейскіх бальшавікоў у мінулым. А лепш арганізацыйна падрыхтаваць кампартыі да рэвалюцыі—гэта значыць уступіць у рашаючыя рэвалюцыйныя бойкі з больш шырокім арганізацыйным базісам, чым бальшавікі ў 1917 г. Калі мы ня ставім перад сабой простай задачы арганізацыйна ахапіць большасьць рабочай клясы ў рамках камуністычнай партыі, дык гэта зусім не азначае, што мы ня можам ахапляць арганізацыйна большасьці яе рашаючых пластоў у рамках беспартыйных арганізацый, стоячых пад уплывам кампартыі (прафсаюзы, камітэты дзеяньняў, стачачныя камітэты, фабзавкомы і г. д.).

„У рашучы момант,—піша Ленін,—у рашаючым пункце мець большую перавагу сіл—гэты „закон" ваенных посьпехаў ёсьць таксама закон палітычнага посьпеху, асабліва ў той заўзятай вайне клясаў, якая завецца рэвалюцыяй".

Стварыць такія ўдарныя базы сярод рашаючых пластоў рабочае клясы —гэта азначае арганізацыйна ўмацавацца ў першую чаргу сярод мэталёўцаў, гарнякоў, транспартнікаў, хімікаў, рабочых электрычнае прамысловасьці, рабочых ваеннае прамысловасьці. Далей, гэта азначае ўмацавацца ў важнейшых прамысловых артэрыях краіны, у тых буйных цэнтрах, перамога пралетарыяту ў якіх будзе мець рашаючы ўплыў на посьпех рэвалюцыі. Па-трэцяе, гэта значыць аўладаць галоўнейшымі пазіцыямі ў важнейшых стратэгічных пунктах клясавага ворага: пошта, тэлеграф, тэлефон, вэрфі, чыгуначныя вузлы і г. д.

Нарэшце, на самым прадпрыёмстве неабходна заваяваць у першую чаргу тыя групы рабочых, бяз удзелу якіх у вытворчым працэсе немажліва нармальнае функцыянаваньне прадпрыёмства.

Да чысткі савецкага апарату.

КОХАНАЎСКІЯ РАЙЁННЫЯ ПРАЦАЎНІКІ НЯ ЛЮБЯЦЬ САМАКРЫТЫКІ. У АПАРАЦЕ БЕЛКУСТПРАМСАЮЗУ НЯ ПРАЦА, А ГУЛЬНЯ. НА ПАСЕЦЫ МЕНАКРЗА ЗЬЯВІЛІСЯ ТРУТНІ.

Начальства гуляе.

У лютым месяцу 1928 году ў Коханаве быў абраны новы склад РВК. Працаўнікі РВК сядзяць—ціха чакаюць новае нач льства.

Вось тутака і пачалося: абвясьцілі ўсім працаўнікам, хто жадае мець апал, каб уносілі грошы. Панясьлі ўсе свае капейкі, закупіў і РВК апалу для раённых устаноў, толькі само начальства не жадае купляць сабе апалу. Пачало цягнуць апал з надворку РВК; старшыня сабе, загадчык земчасткі сабе, заг. Камгасу—сабе і г. д. Цягнуць-пацягнуць,—пакуль амаль усе дровы не пацягалі. Знайшоўся добры хлапец—К., які напісаў аб гэтым у акруговую газэту. Эх тут яны заварушыліся, хто-ды хто пісаў, але так і не даведаліся-б, каб ім не памог добры дзядзька прыехаўшы з Акругов. Грашаддзелу былы заг. Фінчасткі Кохан. РВК ён кажа—калі хто напісаў у газэту, дык гэта — Вакар — рахункавод фінчасткі і Броўкавіч—справавод фінчаст., болей ніхто ня можа ў вас тут у раёне пісаць у газэты.

„А, дык гэта так?"—гаркнуў адзін раз на п'янай вячарыне старшыня РВК т. С. мы ім пакажам такую, гэдкую—кузькіну мачь, век пісаць ня будуць. А тут яшчэ ўдадатак да ўсяго падлізаўся да яго бухгальтар РВК В..., ён ведае што калі з начальствам у аднэй хэўры, д к гэта ляпей, чымся з саюзам знацца, ці ў газэты пісаць. Адзін раз ён прыходзіць у РВК раней за ўсіх, падыходзіць к габінэту „грознага старшыні", пацiхоньку адчыняе дзьверы, рукі трасуцца і пачаў: гэ-гэ ...гм, а калі убачыў, што тоўстая плюха „начальства" расплылася ў крадылаву ўсьмешку дык пачаў: дазвольце мне таварыш С. Слова добрае „молвіць", дзеля—Вас дабра жадаю, супроць Вас тут змовы будуюць два чалавечкі, усюды пра вашу міласьць ня добрае кажуць, гэта яны—Вакар і Броўкавіч у газэту пра вас пісалі пра апал, я сам чытаў, збаўцеся ляпей ад іх, на робяць яны бяды".

Гы...гым...гым...—адкашлянуўся старшыня С.—«дык кажаце... яны... добра... дзьве хвіліны, назад аглядзеўся, сплюнуў і іх няма...

І пайшло пісаць... і пайшло пісаць... Вакара скора па скарэчэньню штататаў убралі, а другога «газэтчыка» ім вельмі трудна дакапацца, ен сядзіць і дзень і ноч у РВК і працуе.

„Ну, ладна, іншым спосабам да яго дабяромся"...

Пачаў старшыня РВК С. перацягваць сваіх людзей-дзе толькі яны былі: з Лядоў — фінінспэктара Касьцюшку (сабутэльнік), з Талочыну Заг. Фінастк.—Міхневіча (забулдыгу-сабутэльніка), адтульжа — „Інжанэра"-будаўніка Шагіна, з Горацкага раёну выпісаў дохтура—Файбіча і шмат іншых.

Гэта цёплая кампанія пачала арганізоўваць сямейныя вечарыны. Пачалі з дохтура Ф.: сабралася ўсё начальства раёнае перад кастрычнікавым сьвятам елі, пілі, сядзелі, гулялі, а напіўшыся пачалі біцца шклянкамі і бутэлькамі, кухлямі... Ці доўга, ці каротка яны біліся але на стале зьвілася яшчэ гарэлка. Яшчэ мацней захмялелі, аж насы насінелі. Начальства і кажа: „Ты—дохтар не клапаціся, мы цябе крыўдзіць ня будзем, усё, што ты затраціў на сеньняшняй вячорыне зьвернецца табе «старыцаю».

І назаўтра, пастанова РВК: «дохтару Ф... за шчыры ўдзел у рамонце больніцы ў працягу трох месяцаў—выдаць 75 рублёў.

Зьвярнуся крыху назад да вячорыны адказных працаўнікоў: Заг. Земчасткай тав. П... не папаў дамоў, а стаў стукаць у чужую хату, калі яму ніхто не адчыніў, ён давай лупіць па вокнах і набіў шыбы гр-ну м. Коханава Белавусаву Максіму. А назаўтра жонка т. П. прынясла Максіму за гэта рубель.

Але-ж і сьцены, нават, маюць вушы. Усё Коханава ведала аб гэтым хуліганскім учынку тав. П. Дайшло гэта к да Райкому КП(б),—вынесьлі за гэта вымову. Далей дайшло і да акр. пракурора. і што-ж вы думаеце? А нічога, справа і сёньня там, у сьледчага па асабістым справам т. К. Ён па два-тры разы вызываў сьведак, ледзь ня ўсё Коханава ў Воршу, вёў аднабаковае дазнаньне, каб пакрыць коханаўскае начальства... Калі сьледчаму К. кажаш: «т. сьледчы, я во забыўся сказаць яшчэ Вам крыху...», а ён адказвае: «перадам справу ў суд, дык вы там можаце ўсё расказаць». Але-ж ён і сёньня перадае справу ў Суд.... ужо болей паўгода.

Вось дзе спайка... вось дзе змычка... гораду з вёскай.

Глядзім, праўда скора аднаго сабутэльніка сакратара РВК Міхневіча зьнялі з працы, другога—Новікава перакінулі ў Амсьціслаў. А Коханаўскі сьледчы Разьнік—дык той зусім у ДОПР утрапіў. Ну астатнія моцна сядзяць. Калі грамадзянская справа Міхневіча папалася Коханаўскаму Нарсудзьдзю Юрэлю, дык ён яе не разглядае ўжо другі год.

Наогул скажу: паглядзі РСІ на Коханаўскі гнойнік хоць у час чысткі партыі і савецкага апарату, многа знойдзеш там „каштоўнага", у весь Коханаўскі раён знае пра пьянства, крыўду, хуліганства, бюракратызм, растраты. А больніца? Дохтар Ф. п'яны аднойчы ўваліўся у барак і пачаў лупцаваць „хвэршала" Сапяжынскага...

Гартаваны.

Апарат без кіраўніцтва.

Апарат Беларускага Саматужна-Прамысловага Саюзу разбух за апошні год у два разы.

Натуральна, што пры такім стыхійным росьце апарату, нехта павінен быў заняцца пытаньнем разьмеркаваньня нанова прымаемых працаўнікоў на месцы, вызначыць ім пэўныя справы і абавязкі, і нарэшце, азнаёміць іх з будучай працай.

На справе-ж нанова прыняты працаўнік, у лепшым выпадку ведае толькі назву сваёй пасады, аклад і ў якім аддзеле ён будзе працаваць.

Такім чынам прыняты некаторыя інструктары ў аргаддзел і некаторыя працаўнікі ў гандлёвы аддзел.

У выніку зьяўляецца сапраўдная гулянка, а ня праца. Атрымана ўказаньне ад ВСНГ БССР аб неабходнасьці выяўленьня процанту зьніжэньня сабекошту па саматужна-прамысловай кааперацыі, аб якасьці прадукцыі. З рэзалюцыяю загадчыка аргаддзелу перадаецца для вывучэньня і адказу па сутнасьці аднаму з інструктароў тав. Т... Гэты таварыш, ня будучы знаёмы, ці правільней азнаёмлены з прынцыпамі працы саматужна-прамысловай кааперацыі, бяз сэнсу блукае па шматлікіх зводках і адказу не знаходзіць; тады праз некалькі тыдняў, гэта праца перадаецца для выкананьня інструктару рацыяналізатару, які нагружан да адказу і мае тэрміновыя зданьні па ўстанаўленьню калькуляцыі і расцэнак для розных галін вытворчасьці.

З інструктары нічога ня робяць, а аклад у кожнага па 160 руб.

Пра аднаго з гэтых інструктароў была спэцыяльная гутарка па зьезьдзе ўпаўнаважаных Бабруйскага Саматужна-Прамысловага Саюзу, дзе была пададзена запіска літэральна наступнага зьместу:

„Нейкія ідыёты сядзяць у Белсампрамсаюзе, якія пасылаюць нам такіх інструктароў?"

Ня лепш справа і ў Гандлёвым Аддзеле. У працягу 6 месяцаў нічога ня робячы прасядзеў ня дрэнны гаспадарнік тав. Т... Ніхто не пацікавіўся, каб даць гэтаму таварышу якую-небудзь сталую працу, за якую ён павінен быў-бы адказваць. Ён штодзённа перакідаўся з аднэй працы на другую, нідзе, зразумела, ніякай карысьці ня прыносіў. Гэта толькі кампрамэтавала старога партыйца з падпольным стажам, пра якога нават пісалі ў газэце, нібыта ён толькі займецца пушчаньнем тытунёвага дыму.

Чужы чалавек трапіўшы ў гэту ўстанову, будзе доўга блытаць пакуль знойдзе каго яму трэба.

Рэгістратура па старынцы. Калі патрэбна якую-небудзь паперку адшукаць, трэба абегаць і аглядзець усе сталы. бо ў кожнага супрацоўніка у стале ляжаць усе адносіны і спраўкі адносна яго працы.

Натуральна паўстае пытаньне. Дзе-ж адміністрацыя? Дзе-ж эканомкамісія?

Адміністрацыя ня хоча зварочваць увагі на дробныя хваравітыя ненармальнасьці ў апараце. Захаваўшыся ў габінэтах, нешта абмяркоўваюць, кагосьці кагосьці скарачаюць, нешта рацыяналізуюць, а з эканомкамісіяй, з апаратным актывам, нават ня хочуць і падзяліцца.

Эканомкамісія робіць усе спробы, каб наладзіць працу. Для таго каб высьветліць ці няма раўналегласьці ў працы пасобных супрацоўнікаў і для таго, каб устанавіць увязку паміж працаю пасобных аддзелаў апарату, эканомкамісія рашыла пусьціць сярод супрацоўнікаў апытальны ліст з трыма пытаньнямі: Прозьвішча, якую працу выконвае і якія канкрэтныя мерапрыёмствы прапануе для палепшаньня сваёй працы і па ўвязцы з іншымі аддзеламі. Эканомкамісія загадзя ўлічвала, што ў такой „узорнай" установе знойдуцца ня менш „узорныя" чыноўнікі, якія палічаць запаўненьне гэтых вестак абразай для свайго аўтарытэту, а таму зьвярнулася да адміністрацыі, каб апошняя садзейнічала ў зьбіраньні гэтых вестак. Аднак адміністрацыя „важна" ад гэтага адмовілася,—неяк не да твару, каб адміністрацыя ня ведала, што робяць свае супрацоўнікі"?..

І што-ж, калі гэта анкета папала да некаторых спэцаў, дык быў атрыман адказ у выглядзе вялікага пытальніка. Першым паказаў прыклад наш стары знаёмы бюракрат, выдатны эканаміст тав. Нахімоўскі.

Што-ж добрая справа сарвана, замест 85 анкет—атрымана ўсяго толькі 12, гэтыя 12 атрымана ад радавых супрацоўнікаў, прычым маюцца вельмі каштоўныя ўказаньні, якія бязумоўна значна паправяць працу.

Голас эканомкамісіі, пакуль зьяўляецца голасам у пустое навэтра. Прапанова аб увядзеньні намой спраўкі засталася ляжаць пад сукном. Вядома, што пры гэткім становішчы энэргія супрацоўнікаў эканомкамісіі паступова пачне падаць, а адміністрацыя сама без дапамогі актыву наўрад ці зможа ўсё гэта правесьці адміністрацыйнымі мерамі. Неабходна, каб саюз і РСІ зьвярнулі ўвагу адміністрацыі на існуючую пастанову адносна эканом-працы.

Усе мерапрыёмствы на абгаварэньне шырокай масы супрацоўнікаў.

Малы

Пчолы і трутні.

Гудуць пчолкі на пасецы Менскага акругова пчалярнага т-ва хутара Струг, што каля плятформы Ждановічы.

Назірае за пасекай сам інструктар па пчалярству ад Менакрза.

Усё быццам ідзе добра. Усё тут у поўным парадку. Чаго жадаць?

І нікому ў галаву ня прыдзе, што паміж працавітых пчолак пасекі Струглоўка прыстасаваліся сапраўдныя трутні.

Такімі трутнямі зьяўляюцца:

Інструктар Менакрза па пчалярству Гаховіч, ён-жа член праўленьня Менскага акруговага пчалярнага т-ва і галоўная спружына ў таварыстве.

Пчаляр «ад нараджэньня», Бялятка, былы настаўнік Апчацкае школы, звольнены з пасады настаўніка за нанясеньне пабояў вучням; ён-жа член рэвізійнай камісіі таварыства; правая рука інструктара Гаховіча.

Вось гэтыя два «слупы» і запраўляюць усімі справамі.

Адчыніў Менакрза пчаліную пасяку на хут. Струг. Справа добрая, пашыраецца пчалярства на Беларусі. Ня дрэнна і для інструктара Гаховіча: ён адразу выкарыстаў яе ў сямейным напрамку. Быў у яго стрэчны брат Тарачка, які ні вуха ні рыла ня мікіціў па пчалярству, але быў беспрацоўным. Пасадзіў гэтага Тарачку інструктар Гаховіч на пасаду пчаляра адчыненай Менакрза пасекі. Справа пашла дрэнна, Менакрза намерыўся перадаць пасяку пчалярскаму т-ву, якое і ўзьняло аб гэтым хадайніцтва, але куды-ж Гаховічу дзявацца з брацёнкам Тарачкай? І паданае ў жніўні 1928 г. Менскім акр. пчалярскім т-вам хадайніцтва аб перадачы пасякі Струг было адхілена, і Тарачка застаўся пчаляром пасякі Менакрза.

Зіма 1928-29 году была доўгая, сярдзітая, маразы трашчалі, мяцелі вылі і стаялі 45 вульляў пасякі Менакрза ў амшаніку разам з 28 вульлямі таварыства.

Прышла вясна 1929 г., выляцілі ў поле пчолкі таварыства з усіх 28 вульляў; ня ўсе пчолкі ляцяць з 45 вульляў пасякі Менакрза: відаць пчаляр Тарачка добра падкарміў пчаліныя сем'і. Агледзялі пчолак і... ліханька—27 раёў адсыпаліся, замарыў іх пчаляр Тарачка!

Тут ужо і інструктар Гаховіч узварухнуўся, клікнуў да сябе сябра верхнага, члена РК пчалярскага т-ва Бялятку, парадзіўся з ім і пачаў: сьпярша выкурыў з праўленьня непатрэбных сьведак (склад праўленьня т-ва зараз новы) перадаў пасяку Струглоўскаму т-ву, назначыў Бялятку пчаляром гэтай пасякі, і канцы ў ваду. Але застаўся яшчэ адзін сьведка, гэта сапраўдны пчаляр Блізьнюк, які добра ведае, што робіцца на пасецы Струг, зараз ён працуе рахункаводам у таварыстве, але мусіць хутка выжывуць і яго з пчалярскага т-ва. Кампанія супроць т. Блізьнюка ўжо пачата. А выклікала гэтага пчаляра з Украіны старае праўленьне т-ва, каб даручыць яму пасяку і, бачыце, як даручыла!

А новы „пчаляр ад нараджэньня" Бялятка працуе ва ўсю.

Даручылі яму ў гэтым годзе закупіць у Барысаве дзеля папаўненьня пасякі Струг 7 новых пчаліных сямей. Паехаў Бялятка ў Барысаў і прывёз 7 вульляў хворых на панос, а адзін дык бяз маткі аказаўся!

Вось дык пчаляр! Хворых пчол ад здаровых не адрозьніў. Чуць усю пасяку не заразіў на гэту страшэнную пчаліную хваробу.

Бялятка жыве ня дрэнна, але кажа, што на пасяцы Струг у яго дрэнна.

Да чаму ня будзе дрэнна, калі ён зацікаўлены, каб у яго на ўласнай пасяцы ў в. Апчаку было добра, якой ён аддае ўвесь час, а за пасекай Струг наглядае брат Гаховіча, які „добры" пчаляр, бо вучыцца на курсах па агнетрываламу будаўніцтву.

Вось дзе трутні. Трэба каб на іх знайшоўся добры пчаляр і ачысьціў пасяку Менскага акруговага т-ва ад шкоднага элемэнту.

Язэп.

УЗМАЦНІМ АБАРОНУ КРАІНЫ.

ЗНАЧНЫ ЛІК УСТАНОЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ З ПРАХЛАДЦАМ РЫХТУЮЦЦА ДА ПРЫЗЫВУ. МЕНСКІ АКРСАВЕТ ТДА-АВІЯХІМУ „ПРАЭКТУЕ". ПЕРАМЕНЬНІК МОЦНА СТАІЦЬ НА ВАРЦЕ, ПАПАЎНЯЕ СВАЕ ВАЙСКОВЫЯ ВЕДЫ І ГАТОЎ ДА АДПОРУ КАПІТАЛІСТЫЧНАМУ НАПАДУ.

Пераменьнік ня дрэмле.

(Гутарка з камандзірам №-скай Беларускай дывізіі тав. Лакціонавым).

Месячны збор пераменнага складу №-скай Беларускай тэрытарыяльнай дывізіі сёлета абяцае прайсьці з вялікім посьпехам вучобы, чымся гэта было ў мінулыя гады.

Па зьвестках, якія ў мяне маюцца—кажа т. Лакціонаў—яўка пераменьнікаў на збор па ўсіх палках сваечасовая. Заўважаюцца толькі асобныя выпадкі спазьненьняў, альбо неяўкі на збор. Гэтыя зьявы маюць яшчэ месца на прычыне дрэннай падрыхтоўкі пераменьніка да збору мясцовымі арганізацыямі.

Міжнародныя абставіны Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік сучаснага моманту, якія ўзьнялі настрой працоўных у сэнсе падрыхтоўкі да абароны краіны, адбіліся і на пераменьніках.

Пры яўках сёлета на збор мы сустракаем бадзёрнага чырвонаармейца, перапоўненага баявой гатоўнасьцю.

Выпадкі расхлябанасьці, хныканьня, жаданьня вызваліцца ад праходжаньня збору зусім ня маюць месца.

На пагрозу вайны супроць Савецкага Саюзу пераменьнік поўнасьцю паказаў свой сьвядомы клясавы твар. Узьняты энтузіязм да абароны сацыялістычнай бацькаўшчыны. На першых-жа сходах пераменьнікаў падавалася сотні заяў аб пасылцы на Ўсход, аб залічэньні ў асобную ўсходнюю армію.

Пераменьнік ня дрэмле. Ён добра разумее сваю ролю ў справе абароны Кастрычнікавай рэвалюцыі. Такім чынам вучоба пачалася пры ўзьнятым настроі і добрай падрыхтоўцы.

Шырока разгорнутае сацыялістычнае спаборніцтва ў дывізіі і сьвядомыя да яго адносіны шырокіх чырвонаармейскіх мас гарантуе дасягненьне максымальных посьпехаў у справе баявой падрыхтоўкі пераменьнікаў і наогул усёй дывізіі.

Рэгістрацыя пераменьнікаў, якія прышлі на рэгістрацыю

НЕЧАКАНЫЯ ГОСЬЦІ

(Малюнак з налёту вайскораў аб прызыве).

Бадзёрая тройка ў чырвонаармейскай вопратцы нечакана ўвайшла ў канцылярыю Менскага акруговага Савету ТДА Авіяхіму.

Гэта вайскораўская група прыйшла праверыць работу па падрыхтоўцы да прызыву.

— Вы там вольныя ад працы, дык калі ласка, да нас на хвілінку—зьвярнуўся з ласкаваю ўсьмешкаю старшыня групы.

— А, калі ласка. Ну, у чым справа?

А вось зараз будзе набор у Чырвоную армію, уся грамадзкасьць рыхтуецца да гэтай кампаніі. Па даручэньню Пады-ва і „Красноармейской Правды" мы прышлі наведаць як вы падрыхтавалі арганізацыю ТДА Авіяхіму да яго?—казаў старшыня групы і адначасова паказвае пасьведчаньне.

— Ага, гэта вайскораўскі налёт, значыць? Уцяміў сабе працаўнік. Ну ды вось што зрабілі.

Па дэмабілізацыі мы арганізавалі для адпускнікоў курсы працаўнікоў ТДА-авіяхіму для вёскі.

Па мабілізацыі нічога не рабілі, таму што няма дырэктыў з цэнтру але з панядзелка 21 жніўня зьбіраліся напісаць райсаветам аб правядзеньні гутарак, вечароў прысьвечаных значэньню Чырвонай арміі, значэньню жараб'ёўкі—закончыў працаўнік. А вы ведаеце, што жараб'ёўка адменена?—спытаў старшыня.

— Не, гэтага я ў газэтах не сустракаў, але думаю, што без жараб'ёўкі лепш.

Ну, а як з літаратурай?

Літаратуры пакуль не разаслалі, але гэта нічога, нам Дзяржаўнае Выдавецтва дасьць і разам з дырэктывамі разашлем.

Шмат іншых пытаньняў было зададзена працаўніку Серабранскаму, але на ўсё ён адказваў „падумаем, пашукаем і зробім абавязкова".

Далей тройка накіравалася да камэнданта станцыі МББ чыгункі. Станцыя... Людзей тут шмат... Ды і грошы адпушчаны. 17 ліпеня, павінны-былі адзначыць кампанію прызыву. Але і тут нічога. Сьцены ў станцыі пустыя, ні лёзунгу, ні плякату, у бібліатэцы лікпункту ёсьць кніжкі, часопісі, але да „прызыву далёка", і кніжкі аб Чырвонай арміі ніводнай.

Тут таксама шмат добрых пажаданьняў, а мала справы.

Налёт трохі раскачаў установы. Трэба не паслабляць працы і правесьці прызыў як належыць.

Янка Булган.

Пад лёзунгам баявой адшліфоўкі.

(Нататкі вайскора).

Лягер імя т. Чарвякова, які толькі некалькі дзён назад аслабаніўся ад навабранцаў, зараз ізноў перапоўніўся новымі гасьцьмі пераменьнікамі.

Кожны год лягерную цішыню парушаюць новыя людзі, якія напаўняюць лягер сьвежым струменем баявой энэргіі.

Нават нельга сказаць, што і ў гэты кароткі перапынак паміж зборамі ў лягеры цішыня. У гэты час камандны склад палка і асобныя часткі палка падтрымліваюць лягернае жыцьцё сваёй упартай падрыхтоўчай працай.

У палатках, леншатрах, кузьнях, усюды рыхтуюцца, стараюцца стварыць умовы для атрымання максымальных дасягненьняў у вучобе пераменьніка.

№ чырвонаштандртны полк добра падрыхтаваўся да сустрэчы пераменьнікаў.

* * *

У адзін дзень лягер запоўніўся людзьмі. Хуткасьць, спрытнасьць, рухавасьць, усё па вайсковаму. У адзін дзень пераменьнік праходзіць некалькі этапаў, якія ператвараюць яго з звычайнага грамадзяніна ў грамадзяніна-чырвонаармейца.

Яўка на збор у сэнсе сваечасовасьці наогул добрая.

Першае месца па сваечасовай яўцы ў палку заняў трэці батальён, і апошніе—першы, ня гледзячы нават на тое, што трэці батальён укамплектаваны пераменьнікамі з далёкіх раёнаў, а першы з блізкіх. Гэты недахоп першага батальёну ў большай меры трэба пакласьці на «душу» партыйных і савецкіх арганізацый таго раёну з якога паходзіць пераменьнікі 1 батальёну за тое, што яны не правялі перад зборам належнай падрыхтоўчай працы, каб забясьпечыць сваечасовую яўку пераменьнікаў на збор.

* * *

Аб чым гавораць.

Звычайна ў першы дзень збору пераменьнікі пад уплывам яго хатніх умоў жыцьця перагаварваюць двесяткі тэм, зьмест якіх бывае самы рознаколерны.

У гэты збор усе размовы пераменьнікаў маюць свой характэрны адбітак. Да якой-бы вы групы не падышлі ўсюды гавораць аб адным, аб міжнародным становішчы, аб абароне меж Савецкага Саюзу ад нападу буржуазеі. Кітай... Падзеі на Усходзе самая цікавая, хвалюючая пераменьніка тэма. Клясавая нянавісьць да імпэрыялістычнай буржуазеі, рашучасьць да абароны сацыялістычнай бацькаўшчыны—вось што выпірае ў настроях пераменьнікаў.

У пацьверджаньне гэтага гавораць той факт, што на палкавым сходзе 25-га жніўня пасьля дакладу камандзіра дывізіі т. Лакціонава аб міжнародным становішчы і задачах збору было пададзена пераменьнікамі шмат запісак аб жаданьні запісацца ў дабраахвотніцкую Ўсходнюю армію. Даць адпор кітайскім белабандытам—вось аб чым думаюць зараз пераменьнікі.

ПАД ЛЁЗУНГАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА.

Такія настроі, бязумоўна, гарантуюць посьпехі ваенна-палітычнай вучобы пераменьнікаў. Пад лёзунгам сацыялістычнага спаборніцтва распачалася вучоба пераменьнікаў. Пад лёзунгам большых дасягненьняў у ваенна-палітычнай вучобе за лепшае ўсваеньне рашэньняў 16 партканфэрэнцыі і 10 пленуму Вык. Кам. пад лёзунгам барацьбы з прагуламі, самавольнымі адлучкамі, барацьбы з усялякімі праявамі не дысцыплінаванасьці, якія падрываюць баявую моц і гатоўнасьць Чырвонай арміі. Аб тым, што гэтыя пункты сацыялістычнага спаборніцтва будуць выкананы, сьведчыць той энтузіязм, з якім пераменьнікі распачыналі сваю вучобу.

Ян. Чар.

Падрыхтоўка да прызыву

Каб лепш праверыць, як праходзіць падрыхтоўка да прызыву па Магілеву групай вайскораў быў утворан налёт на некаторыя ўстановы і прадпрыемствы.

Высьветлілася, што ў гэтай галіне Магілеўскім Акрваенкаматам зроблена ўсё неабходнае. Пад прызыўны пункт адведзена добрае памяшканьне, дзе прызыўнікі змогуць і застанавіцца на патрэбны час. Дагаворана з ЦРК аб здавальненьні прызыўнікоў харчамі і аб водпуску па ільготным цэнам тавараў маламожным прызыўнікам. Па раёнах разасланы дырэктывы па партыйнай і савецкай галіне, таксама і лёзунг, у ліку 5000 экз. Арганізавана камісія па выяўленьні клясава-чужога элемэнту, якая ўжо заканчвае працу. Складзены сьпісы тылаапалчэнцаў. Падрыхтавана нават і для склікаваньня канфэрэнцый прызыўнікоў у канцы жніўня. Камісія па выяўленьню ільгот ужо скончыла працу.

Але побач з гэтым маюцца і недахопы. Некаторыя з раёнаў да гэтага часу не прадставілі сьпісаў клясава-чужога элемэнту, а некаторыя запоўнілі гэтыя сьпісы вельмі вялікай колькасьцю асоб (Чавускі р. больш 100 чалавек). Не па ўсіх раёнах разгорнута масава-растлумачальная работа. Нават і ў г. Магілеве мы маем выпадкі калі партыйныя, камсамольскія і прафэсыйныя арганізацыі на прадпрыемствах і не пачыналі працы. У акруговай газэце гэта кампанія сваечасова і рэгулярна асьвятляецца.

Хмуры.

З некаторым „прахладцам".

Падрыхтоўчая праца да прызыву грамадзян нараджэньня 1907 г. у Полацкай акрузе ў асноўным разгарнулася. Праводзіцца вялікая праца па лініі партыйных, камсамольскіх і інш. арганізацый. У шэрагу раёнаў і сельсаветаў адбыліся спэцыяльныя канфэрэнцыі дапрызыўнікаў, якія азнаёмілі будучых байцаў з задачамі прызыву і міжнародным становішчам.

Каб праверыць увесь ход падрыхтоўчай працы, вайсковыя і рабочыя карэспандэнты гор. Полацку гэтымі днямі наладзілі спэцыяльны налёт на акруговыя ўстановы і клюбы, па пытаньні—як яны рыхтуюцца да прызыву, якія маюцца недахопы. У налёце прымала ўдзел 20 таварышоў і выяўлена наступнае:

Гарсавет. Падрыхтоўчая праца вядзецца. Выяўляюцца такія асобы, якім не павінна быць месца у шэрагах Чырвонай арміі. Намечана палітасьветная праца з прызыўнікамі. Усім установам дадзена заданьне, каб апошнія паведамілі—колькі іх працаўнікоў уходзіць у армію, на месца якіх будуць прымацца дэмабілізаваныя чырвонаармейцы.

Акрінспэктарыят нарасьветы: Дадзены указаньні ўсім раёнам, што трэба зрабіць па абслугоўваньні прызыўнікоў. Раёны не даюць ніякай інфармацыі аб ходзе працы. Праверка адсутнічае. У горадзе будзе налажана культурнае абслугоўваньне дапрызыўнікаў.

Прафсаюзы. Вядуць падрыхтоўку слаба. Высьвятлена, што дырэктывы аб прызыве з боку Акруговага Бюро Прафэсыянальных Саюзаў дасланы прыблізна з месяц таму назад, але гэтыя дырэктывы некаторыя саюзы (будаўнікі) яшчэ не атрымалі. Частка саюзаў адносяцца да гэтай важнай кампаніі з некаторым прахладцам бяз усялякай уважлівасьці.

Клюбы асьветнікаў, саматужнікаў і рабземлесу амаль нічога не зрабілі ў гэтай галіне, ня гледзячы на тое, што на іх ускладаецца вялікая культурная праца. Тут трэба зрабіць вялікі пералом.

З боку акрваенкамату робіцца ўсё патрэбнае да прызыву. Але ўсім арганізацыям Полаччыны трэба яшчэ будзе зьвярнуць вялікую ўвагу на падрыхтоўку да прызыву 1907 г.

Сьпір. Міхальцоў.

ПРАБЛЕМА КАДРАЎ У КАЛГАСНЫМ РУХУ.

Велізарны размах калгаснага руху, якім у сучасны момант апанавана вёска ставіць перад намі шэраг актуальнейшых задач у справе замацаваньня дасягнутых посьпехаў і далейшага разьвіцьця аграмаджаньня індывідуальных гаспадарак. Адною з такіх надзвычайна важных задач зьяўляецца праблема кадраў у калгасным руху.

Падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў працаўнікоў арганізатараў культурнікаў, тэхнічнага пэрсаналу для калгасаў асабліва набывае ў сучасны момант вялікае значэньня. Да апошняга часу ў большасьці мы мелі дробныя калгасы як па ахопу колькасьці сямей, так і па плошчы займаемай імі зямлі. У сучасны момант разам з арганізацыяй новых буйных калгасаў ідзе праца узбуйненьня старых. Калі ў дробных калгасах арганізаваныя працы, унутраны распарадак жыцьця параўнальна ня так складаны, то гэтага зусім нельга сказаць адносна буйных калгасаў.

Буйныя калгасы, якія арганізоўваюцца на плошчы 1000 і больш гэктараў зямлі і ахапляюць цэлыя вялікія вёскі патрабуюць надзвычайнай арганізаванасьці працы, уменьня наладзіць унутранае жыцьцё, рацыянальна скарыстоўваць рабочую сілу, добра паставіць гаспадарку, наладзіць культурную працу, паставіць з боку тэхнічнага добра вучот маёмасьці і г. д. Каб з гэтымі задачамі калгасы маглі справіцца, патрэбны адпаведныя кадры працаўнікоў арганізатараў, тэхнікаў, аграномаў і культурнікаў.

Ці маем мы гэтыя кадры? Трэба адзначыць, што мы ня толькі маем, але да апошняга часу ня прымалася ніякіх мер, каб іх падрыхтаваць, а між тым недахват працаўнікоў адчуваецца літаральна ва ўсіх галінах калгаснага будаўніцтва. Вось чаму падрыхтоўка і перападрыхтоўка кіруючых кадраў для калгасаў набывае рашучае значэньне.

Праўда ў апошні час у справе падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кіруючых кадраў працаўнікоў мы маем ужо намечаныя некаторыя мерапрыёмствы, якія будуць ажыцьцяўляцца ў гэтым годзе. Так, для падрыхтоўкі спэцыялістаў высокай кваліфікацыі, аграномаў арганізатраў калгаснага будаўніцтва пры Горацкай сельска-гаспадарчай акадэміі адчыняецца факультэт калгаснага земляробства, які разьлічаны на 90—95 асоб. Факультэт можа даць спэцыялістаў толькі праз 4—5 год, такім чынам у бліжэйшы пэрыяд усё-ж мы будзем адчуваць недахват кадраў спэцыялістаў гэтай кваліфікацыі.

Дзеля таго, каб запоўніць гэты недахват у спэцыялістых, які адчуваецца ў сучасны момант і які будзе адчувацца з цягам часу яшчэ больш, неабходна зараз-жа намеціць шэраг мерапрыёмстваў, якія ў бліжэйшы пэрыяд далі-б патрэбныя кадры для калгаснага будаўніцтва. Нам здаецца, што было-б правільна і карысна ўжо ў гэтым годзе перабудаваць адпаведным чынам навучальныя пляны і праграмы старэйшых курсаў некаторых факультэтаў і аддзяленьняў сельска-гаспадарчай акадэміі, увёўшы дысцыпліны па калектывізацыі сельскай гаспадаркі, каб у самым хуткім часе падрыхтаваць неабходных арганізатараў спэцыялістаў калгаснага будаўніцтва.

Гэтым мерапрыёмствам, зразумела, не вычэрпваецца пытаньне кадраў, нават у самай мінімальнай ступені. Пры тым тэмпе калектывізацыі сельскай гаспадаркі, які ў сучасны момант мы маем, а гэты тэмп будзе ў далейшым узрастаць яшчэ больш, у высокакваліфікаваных працаўніках мы доўга будзем адчуваць недахват. Вось чаму паўстае пытаньне недахват высокакваліфікаваных аграномаў і інжынэраў папоўніць за кошт узмацненьня тэмпу падрыхтоўкі працаўнікоў сярэдняй кваліфікацыі праз сельска гаспадарчыя тэхнікумы і ніжэйшыя сельска-гаспадарчыя школы.

Патрэба ў спэцыялістых вышэйшай кваліфікацыі для ўсіх галін гаспадаркі—малочнай, жывёлагадоўчай, агародна-садовай, ільняной і г. д. надзвычайна вялікая. Спэцыялістаў сярэдняй кваліфікацыі ў нас рыхтуюць сельска-гаспадарчыя тэхнікумы, але да жалю трэба адзначыць, **што нашы тэхнікумы яшчэ рыхтуюць спэцыялістаў наогул.** А між тым перабудова індывідуальных сялянскіх гаспадарак у формы калектыўныя, а таксама вялікія магчымасьці павялічэньня тэмпу калектывізацыі нават супроць праэктыроўкі пяцігодкі, прымушаюць нас фарсыраваць падрыхтоўку спэцыялістаў у адпаведнасьці з запатрабаваньнямі стварэньня новых форм сельскай гаспадаркі.

Адсюль выцякае неабходнасьць як адчыненьня новых навучальных установ з мэтай падрыхтоўкі спэцыялістаў сярэдняй кваліфікацыі для калгаснага будаўніцтва, так і прыстасаваньня праграм і навучальных пляноў існуючых тэхнікумаў да запатрабаваньняў калектыўных форм сельскай гаспадаркі. У гэтым годзе Наркамасьветы адчыняе ў Канічах, Магілеўскай акругі тэхнікум калгаснага будаўніцтва. У тэхнікум будзе прынята 40 чалавек, лічба невялікая, Вось чаму перш усяго неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу **на сыстэму** падрыхтоўкі ў існуючых тэхнікумах, каб наблізіць іх да калгасаў і палепшыць склад студэнцтва за лік уцягненьня калгасьнікаў. Нам здаецца, што проста трэба было-б устанавіць бронь месц у тэхнікумах для калгасьнікаў.

Поруч з гэтым пытаньне і аб палепшаньні складу выкладчыкаў сельска-гаспадарчых тэхнікумаў павінна прыцягнуць вялікую ўвагу. Неабходна налегчы на іх перападрыхтоўку, шырока выкарыстоўваць курсы і завочнае навучаньне. Апроч гэтага неабходна забясьпечыць тэхнікумы найноўшаю спэцыяльнаю літаратураю. Гэтыя мерапрыёмствы па нашай думцы дадуць належны эфэкт і мы будзем такім чынам у бліжэйшы пэрыяд мець патрэбных нам спэцыялістаў для калгаснага будаўніцтва.

Акрамя падрыхтоўкі кадраў спэцыялістаў арганізатараў калгаснага руху высокай і сярэдняй кваліфікацыі, трэба паруніцца і аб падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы калгаснага актыву, кваліфікаваных рабочых. У гэтых адносінах можа значна дапамагчы сыстэма кароткатэрміновых курсаў, а таксама школы сялянскай моладзі. Наркамасьветы ў гэтым навучальным годзе мяркуе ў м. Смальлянах адчыніць з першага кастрычніка аднагадовую школу калгаснага будаўніцтва. Мяркуецца правесьці на працягу зімы 48 кароткатэрміновых курсаў для саўгасаў і калгасаў а таксама ў кожным раёне правесьці сельска-гаспадарчыя паўтарамесячныя курсы.

Уся сыстэма курсаў, якія толькі будуць адчыняцца па сельскай гаспадарцы, павінна ў першую чаргу ахапіць калгасьнікаў. Аб гэтым павінен патурбавацца Белкалгассаюз, арганізатары курсаў, мясцовыя савецкія органы і грамадзкія арганізацыі. Сыстэму школ сялянскай моладзі таксама трэба прыстасаваць да калектыўнага будаўніцтва, прыстасаваўшы адпаведным чынам праграмы, навучальныя пляны і забясьпечыўшы адпаведны лік месц у гэтых школах для калгасьнікаў. Трэба ўнесьці як правіла пасылку скончыўшых школы сялянскай моладзі ў калгасы. У Полацкай акрузе ў бягучым годзе гэта было ўжо прароблена.

Ня менш востра, чымся пытаньне аб кадрах спэцыялістаў, стаіць пытаньне аб кадрах для разгортваньня культурнай працы ў калгасах. Сапраўды, для разгортваньня культурнай працы ў калгасах стварающца вельмі цяжкія ўмовы, менавіта з-за адсутнасьці культурных сіл. Культурнымі сіламі калгасы трэба забясьпечыць. Павялічыць і палепшыць склад культурных працаўнікоў у калгасах можна двума спосабамі: па-першае, зрабіць пэўнае пераразьмеркаваньне, перакінуўшы ў калгасы з іншых арганізацый, з гораду, мястэчак, больш-менш буйных сёл; падругое, неабходна ўзмацніць падрыхтоўку культурных і палітычных працаўнікоў для калгасаў.

Дзеля таго, каб разгарнуць працу па падрыхтоўцы палітычных і культурных працаўнікоў для калгасаў, трэба прыстасаваць савпартшколы некаторыя, якія павінны перабудаваць адпаведным чынам сваю працу. Магілеўскі палітасьветны тэхнікум таксама павінен перабудаваць сваю працу ў некаторай ступені для падрыхтоўкі культурнікаў для калгасаў. Падрыхтоўка культурных працаўнікоў для калгасаў павінна праходзіць галоўным чынам з кадраў калгасьнікаў. Вось чаму пры камплектаваньні савпартшкол, курсаў, пэдтэхнікумаў, палітэхнікуму, ВНУ і інш. неабходна значна больш уцягваць калгасьнікаў.

Падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў арганізатараў, спэцыялістаў, культурнікаў і г. д. для калгаснага будаўніцтва павінна праводзіцца ў пляновым парадку. У адпаведнасьці з тым тэмпам, які намечан пяцігодкай па калектывізацыі сельскай гаспадаркі і ў які жыцьцё ўжо ўносіць карэктывы перавышаючы лічбовыя паказальнікі пяцігодкі, трэба будаваць працу па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў. У супраціўным выпадку мы будзем мець шэраг цяжкасьцяў, затрымак у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

У заключэньне трэба адзначыць, што культурная справа дрэнна пастаўлена ў калгасах. У самы бліжэйшы пэрыяд цяжка будзе даць працаўнікоў у калгасы для наладжваньня яе, а жыцьцё не чакае, культурны ўзровень калгасьнікаў трэба ўзьнімаць, бо ад гэтага залежыць і гаспадарчая дзейнасьць, вось чаму трэба на мясцох мабілізаваць грамадзкую думку навокал пытаньня належнай пастаноўкі культурнай працы ў калгасах і з тымі сіламі, якія ёсьць максымальна разгортваць яе. У справе дапамогі пастаноўцы культпрацы ў калгасах трэба мабілізаваць вясковую інтэлігенцыю. Прафсаюзы працасьветы, мэдсанпрацы і іншыя могуць значна дапамагчы ў гэтай справе.

Мацюкевіч.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА ЭКАНОМНАРАДЫ ПРЫ СНК БССР

ПРА МЕРАПРЫЁМСТВЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА БУДАЎНІЧАГА СЭЗОНУ 1929-30 г.

У мэтах забесьпячэньня сваечасовай падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону 1929-30 году, Эканамічная Нарада пры СНК БССР пастанаўляе:

I. У ЧАСТЦЫ СКЛАДАНЬНЯ ПРАГРАМЫ БУДАЎНІЦТВА.

1. Абавязаць усе будуючыя арганізацыі ў месячны тэрмін па зацьверджаньні кантрольных лічбаў скласьці дакладныя сьпіскі аб'ектаў будаўніцтва, намечаных да ажыцьцяўленьня ў 1929-30 г., з паказаньнем месца пабудовы, кошту кожнага аб'екта з разьмеркаваньнем затрат па гадох, выдзяляючы паасобку кошт абсталяваньня і крыніц фінансаваньня. Сьпісак прадставіць Камітэту па Будаўніцтву не пазьней 15 кастрычніка 1929 г.

Абавязаць Камітэт па Будаўніцтву на падставе гэтых даных скласьці праграму ўсяго будаўніцтва ў Рэспубліцы і прадставіць гэтакую не пазьней 15-XI-29 г. у ЭКАНА БССР.

2. Абавязаць усе будуючыя арганізацыі ў тэрміновым парадку праверыць у якім становішчы знаходзіцца праэктаваньне, маючы на ўвазе, што зацьверджаньне ўсіх праэктаў будаўніцтва 1929-30 г. павінна быць скончана не пазьней 1-XII-1929 г. для прадстаўленьня іх у органы будаўнічага кантролю не пазьней 15-XII.

3. Дазволіць дзяржаўным органам і каапэрацыйным і грамадзкім установам выдаткоўваць неабходныя сумы на праэктныя работы па будаўніцтву 1929-30 г. з крэдытаў 1928-29 г. у лік асыгнаваньняў 1929-30 г.

4. Прапанаваць усім наркаматам, акрвыканкомам, каапэрацыйным і грамадзкім арганізацыям пры складаньні фінансавых пляноў і праграм будаўніцтва 1929-30 г. прадугледзіць неабходныя сумы для праэктыровачных, выведніцкіх і дасьледчых работ па будаўніцтву 1930-31 г. у разьмеры 2-х процантаў ад агульнага кошту будаўніцтва.

5. Абавязаць ведамствы і ўстановы, пры складаньні праграм будаўніцтва, ухіляцца расьцягваньня тэрміну будаўніцтва па асобным аб'ектам на некалькі гадоў, і улічваць неабходнасьць згрупаваньня работ для дасягненьня мінімальных тэрмінаў сканчэньня будаўніцтва па намечаных праграмай аб'ектах.

6. Абавязаць усе будуючыя арганізацыі і ўстановы скласьці да 1-га лютага 1930 году гадавыя каляндарныя пляны вытворчасьці работ і каляндарныя пляны фінансаваньня будаўніцтва.

II. У ДАЧЫНЕНЬНІ ПРАЭКТАВАНЬНЯ.

1. Прапанаваць будуючым арганізацыям у максымальнай ступені скарыстаць тыпавыя і рэкамандаваныя праэкты, у асаблівасьці тыя з іх, якія ўжо паказалі сваю мэтазгоднасьць.

2. Абавязаць да 25 верасьня 1929 г. выбраць і апублікаваць сьпісак тыпавых і рэкамандаваных праэктаў: НК Аховы Здароўя—па бальнічнаму будаўніцтву, НК Асьветы—па школьнаму будаўніцтву, ВСНГ—па прамысловаму, Белжылсаюзу па жыліщчнаму будаўніцтву, НКЗему—па сельскаму будаўніцтву.

3. Абавязаць усе будуючыя і праэктуючыя арганізацыі пры праэктаваньні строга кіравацца выданымі і выдаваемымі нанова тэхнічнымі нормамі КАМСПА і Камітэту па Будаўніцтву пры ЭКАНА БССР.

4. Каб зьбегнуць будаўніцтва без захаваньня праэктнай дысцыпліны прапанаваць органам будаўнічага кантролю ўзмацніць у гэтым напрамку кантроль, прыцягваючы ў неабходных выпадках парушыцеляў да законнай адказнасьці.

III. У ДАЧЫНЕНЬНІ ЗАБЯСЬПЕЧАНЬНЯ БУДМАТАР'ЯЛАМІ

1. У мэтах сваечасовага выяўленьня патрэбы ў будаўнічых матэрыялах прапанаваць усім будуючым арганізацыям не пазьней 1-IX-29 г. прысылаць НК Гандлю заяўкі на патрэбныя ім матар'ялы для будаўніцтва 1929-30 г., вызначаныя згодна нормы, устаноўленых Камітэтам па Будаўніцтву.

Прапанаваць НК Гандлю і Камітэту па Будаўніцтву ўдакладніць гэтыя заяўкі і не пазьней 1 сьнежня 1930 г. прадставіць канчатковы баланс патрэбных на 1929-30 год будаўнічых матар'ялаў ЭКАНА.

2. Абавязаць усе будуючыя арганізацыі закончыць дагаворы на пастаўку буд матар'ялаў не пазьней 1-IX-29 г.

3. Прапанаваць ВСНГБ праз Дзяржплян прадставіць у ЭКАНА не пазьней 1-X-29 г. канкрэтны плян разгортваньня вырабу будаўнічых матар'ялаў на 1929-30 год па рэспубліканскай, мясцовай і саматужна-каапэрацыйнай прамысловасьці ў акруговым разрэзе з вучотам максымальнага разгортваньня і патаненьня вырабу будматар'ялаў.увядзеньня бесперарыўнага рабочага тыдню, падаўжэньня вытворчага сэзону, рацыяналізацыі вытворчых працэсаў і г. д.

4. Прапанаваць ВСНГБ прысьпешыць мерапрыемствы па вырабцы стандартаў будматарыялаў і на беладраўляным заводзе ў Бабруйску фарсіраваць выпуск асобных будаўнічых дэталяў.

5. Прапанаваць ВСНГБ у месячны тэрмін распрацаваць і прадставіць у ЭКАНА канкрэтныя мерапрыемствы па падвышэньні якасьці будматарыялаў, якія выпрацоўваюцца ў БССР.

6. Прапанаваць ВСНГБ прадставіць у ЭКАНА не пазьней 1-IX—29 г. даклад аб праробленай ім рабоце па перадачы прамысловай каапэрацыі і саматужным арцелям бяздзейнічаючых прадпрыемстваў па вырабу будаўнічых матарыялаў і аб атрыманым эфэкце ад гэтых мерапрыемстваў.

7. Прапанаваць ВСНГ і акрвыканкомам арганізаваць пры ўмове рэнтабельнасьці мэханічнае здабываньне пяску, гравію, гліны і г. д.

8. Прапанаваць Белсампрамсаюзу ўзмацніць тэмп каапэрацыйных саматужнікаў, якія вырабляюць будаўнічыя матарыялы і ў прамфінпляне на 1929-30 г. прадугледзіць узмацнёнае разьвіцьцё вырабу будматарыялаў.

9. Прапанаваць акрвыканкомам у мясцовых бюджэтах на 1929-30 г. прадугледзіць зьніжэньне арэндных ставак і мясцовых падаткаў для саматужна-прамысловай каапэрацыі ў мэтах зьніжэньня загатоўчых цэн на будматарыялы.

10. Прапанаваць будуючым і будаўнічым арганізацыям шырока практыкаваць авансіраваньне і кантрактацыю будаўнічых матарыялаў, выпускаемых прадпрыемствамі саматужна-прамысловых арцеляў, якія аб'ядвае Белсампрамсаюз.

11. На падставе пастановы СНК СССР ад 4 ліпеня г.г. прапанаваць НК Гандлю сумесна з Белсампрамсаюзом распрацаваць інструкцыю аб аб'ёме і тэрмінах кантрактацыі будматарыялаў і ўмовах разьліку. Паказаную інструкцыю—прадставіць на зацьверджаньне ЭКАНА не пазьней 1-X—1929 г.

12. Даручыць НК Гандлю прыняць тэрміновыя меры па выкананьню пляну снабжэньня лесазагатавіцельных арганізацый харчамі і фуражом у адпаведнасьці з плянам загатоўкі.

13. Даручыць НК Гандлю адпускныя цэны на ўсе віды будаўнічых матарыялаў па акругах і раёнах устанавіць і апублікаваць не пазьней 1-X—29 г.

14. З мэтаю сваечасовага фінансавага забясьпечаньня будаўніцтва на падрыхтоўчыя работы і загатоўку будаўнічых матарыялаў прапанаваць НКФіну адпускаць штомесячна ў кастрычніку, лістападзе і сьнежані па 10 проц. ад усяго кошту гадавога будаўніцтва з тым, каб уся сума фінансаваньня за 1-е паўгодзьдзе 1929-30 г. складала ня менш 50 проц. ад устаноўленага гадавога пляну фінансаваньня.

15. Абавязаць Белкамунбанк зрабіць разьмеркаваньне крэдытаў на рабочае і жыльлёвае будаўніцтва паміж катэгорыямі заёмшчыкаў да 15-XII—1929 г. з тым, каб заключэньне дагавароў на доўгатэрміновыя крэдыты закончыць не пазьней 1-I—1930 г.

Прапанаваць Белкамунбанку ўстанавіць фінансаваньне жыльлёвага будаўніцтва з такім разьлікам, каб забудоўшчыкі маглі сваечасова забясьпечыць сябе будаўнічымі матарыяламі шляхам авансаваньня і кантрактацыі іх.

16. Прапанаваць усім будуючым арганізацыям скласьці да 1-X—1929 г. каляндарны плян перавозкі будматарыялаў, з максымальным скарыстаньнем зімовага пэрыяду для гужавога транспарту.

17. У мэтах узмацненьня і ўрэгуляваньня гужавога транспарту будаўнічых матарыялаў прапанаваць:

а) Белсампрамсаюзу—узмацніць работу па аб'яднаньню прамыслова-каапэрацыйных транспартных арцеляў у гарадох і мястэчках;

б) НК Сацыяльнага Забясьпечаньня—па лініі камітэтаў селянскіх т-ваў узаемадапамогі—арганізаваць сялянскія арцелі гужавога промыслу;

в) Белдартрансу—распрацаваць сыстэму мерапрыемстваў па павялічэньню ўжываньня аўта-транспарту для перавозкі будаўнічых матарыялаў;

г) усім будаўнічым арганізацыям — ужываць сыстэму кантрактацыі сялянскага гужа на працяжныя тэрміны;

д) НК Гандлю—устанавіць на 1929-30 г. гранічныя стаўкі па акругам на гарадзкія і прыгародныя перавозкі будматарыялаў.

IV. У ЧАСТЦЫ ЎРЭГУЛЯВАНЬНЯ РЫНКУ ПРАЦЫ

1. Абавязаць усе будуючыя ўстановы і арганізацыі не пазьней 15-XII—30 г. прадставіць у мясцовыя біржы працы папярэдня заяўкі аб патрэбнай ім рабочай сіле па прафэсіям і спэцыяльнасьцям, склаўшы каляндарны плян патрэбнасьці рабочай сілы па месяцам, выходзячы з зацьверджаных Камітэтам па будаўніцтву норм.

2. Абавязаць НК Працы прадставіць агульны баланс рабочай сілы для ўсей Беларускай Рэспублікі ў Камітэт па Будаўніцтву не пазьней 20 студзеня 1930 г., з паказаньнем канкрэтных крыніц забясьпечаньня кваліфіцыраванай рабочай сілай.

3. Даручыць дзяржаўным гаспадарчым органам распрацаваць і ўзгадніць з адпаведнымі органамі прафэсіянальных саюзаў паакруговыя зьдзельныя расцэнкі, пасьля чаго апублікаваць іх не пазьней 1—15 лютага 1930 г.

4. Даручыць Народнаму Камісарыяту Гандлю, сумесна з Белкаапсаюзам распрацаваць не пазьней 1 лютага 1930 г. пытаньне аб забясьпечаньні харчамі будаўнічых рабочых буйных будаўнічых пунктаў.

5. Прапанаваць усім будаўнічым арганізацыям прыняць меры к таму, каб да часу разьвіцьця будаўнічых работ у сэзоне 1929-30 г. рабочыя былі забясьпечаны жыльлём.

6. Прапанаваць усім будуючым і будаўнічым арганізацыям сваечасова забясьпечыць свае будаўніцтва інжынэрна-тэхнічным пэрсаналам і паведаміць у Камітэт па Будаўніцтву не пазьней 1-X-1929 году зьвесткі аб наяўнасьці, патрэбнасьці і пэрспэктывах папаўненьня гэтых кадраў.

7. Для скарачэньня патрэбнасьці ў тэхпэрсанале абавязаць будуючыя ўстановы і будаўнічыя арганізацыі прыняць меры да разгрузкі тэхпэрсаналу ад неўласьцівых яму функцый, якія могуць быць выкананы асобамі іншых кваліфікацый.

V. У ДАЧЫНЕНЬНІ ВЫТВОРЧАСЬЦІ РАБОТ.

1. Заяўкі на адвод зямельных вучасткаў для дзяржаўных прамысловых прадпрыемстваў павінны быць пададзены ў адпаведныя камунальныя і зямельныя органы не пазьней 1 кастрычніка 1929 году, і для астатняга будаўніцтва—не пазьней 1 сьнежня 1929 г., а адпаведныя дагаворы, у выпадку здавальненьня заяўкі аб адводзе зямельных вучасткаў, павінны быць заключаны не пазьней месяца ад дня падачы заяўкі.

2. Па будаўнічым работам, якія выконваюцца падрадным спосабам, будуючыя арганізацыі і ўстановы абавязаны заключыць дагаворы з будаўнічымі арганізацыямі не пазьней 15-1-30 г.

3. Абавязаць будуючыя і будаўнічыя арганізацыі ўсямерна выкарыстаць зімовы час на падрыхтоўчыя і тэхнічна ў гэты пэрыяд магчымыя будаўнічыя работы.

4. Прапанаваць будаўнічым арганізацыям у сваіх вытворчых [illegible] на 1929-30 г. прадугледзіць поўны ахоп тэрыторыі БССР.

5. У мэтах упарадкаваньня фінансавага становішча будаўнічых арганізацый і прывядзеньня разьмераў іх капіталаў да адпаведнасьці з патрабаваньнямі СПА, даручыць Дзяржпляну і НКФіну распрацаваць канкрэтна мерапрыемствы па ўпарадкаваньню фінансавага палажэньня бударганізацый, і праект унесьці ў ЭКАНА БССР не пазьней 15-IX-29 г.

6. Удакладненыя каляндарныя пляны будаўніцтва па кожнаму аб'екту павінны быць зацьверджаны да пачатку будаўнічага сэзону.

7. Рабочыя рысункі па зацьверджаным і дазволеным праэктам павінны быць закончаны да 1 сакавіка 1930 г.

8. Абавязаць кіраўніцтва будкантролю выдаваць дазвол на прыступ к рабоце па зацьверджаным праектам не пазьней 2-х тыдняў з часу атрыманьня праэкту.

9. Прапанаваць усім будуючым арганізацыям і ўстановам сваечасова, да прыступу к работам, распрацаваць канкрэтны плян мерапрыемстваў па палепшаньню якасьці будаўніцтва і патаненьню яго, якія пляны павінны быць прыкладзены да праэктаў, якія прадстаўляюцца ў органы будаўнічага кантролю на дазвол ці зацьверджаньне.

10. Узмацніць дзейнасьць органаў будаўнічага кантролю на мясцох па нагляданьню за правядзеньнем на пабудовах намечаных, згодна праэктаў і пляну, мерапрыемстваў па палепшаньню і патаненьню будаўніцтва.

VI. У ДАЧЫНЕНЬНІ ПРАВЕРКІ ПАДРЫХТОЎКІ БУДУЮЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ К БУДАЎНІЦТВУ.

1. Лічыць неабходным, каб органы РСІ і будаўнічага кантролю рабілі нагляд у адносіне сваечасовасьці выкананьня мерапрыемстваў да падрыхтоўкі да будаўніцтва 1929-30 г. у мэтах прыняцьця адпаведных мер.

2. Абавязаць будаарганізацыі, ведамствы і ўстановы дакладваць Камітэту па Будаўніцтву, у тэрміны ім устанаўляемыя, аб ступені падрыхтоўнасьці да будаўнічага сэзону 1929-30 г.

3. Прапанаваць арганізацыям, ведамствам і ўстановам прыняць к няўхільнаму і сваечасоваму выкананьню ўсе абежнікі і запытаньні Камітэту па будаўніцтву, адносячы невыкананьне іх да дзейнасьцяў, якія перашкаджаюць рэгуляваньню будаўніцтва.

4. Даручыць Камітэту па Будаўніцтву, акруговым інжынэрам і будаўнічым арганізацыям арганізаваць нарады і даклады аб ходзе падрыхтоўкі да будаўніцтва 1929-30 г. і прыняць усе меры для папулярызацыі і распаўсюджваньня выдаваемых распараджэньняў, новых норм, правіл і г. д.

Час. вык. аб. Старшыні Эканамічнай Нарады пры СНК БССР **Калнін.**

Нам. Кіраўніка Спраў СНК і Эканамічнае Нарады БССР **В. Крывіцкі.**

29 жніўня 1929 году.
г. Менск.

ХРОНІКА

Абвясьцілі сябе мабілізаванымі на фронце барацьбы з няпісьменнасьцю.

Учора на аб'яднаным сходзе курсанты 6 і 4 месячных настаўніцкіх курсаў у ліку 230 чалавек абгаварылі пытаньне аб удзеле настаўніцтва ў ліквідацыі няпісьменнасьці.

Курсанты пастанавілі лічыць сябе мабілізаванымі для працы ў грамадзкім парадку па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Аб зьніжэньні сабекошту ў будаўніцтве

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму ЦП саюзу будаўнікоў быў заслуханы даклад гандлёва-будаўнічага трэсту аб зьніжэньні сабекошту ў бягучым будаўнічым сэзоне.

— Будаўніцтва па лініі гандаль-буду прадугледжана ў 3 з пал. млн рублёў. Частка работ будзе скончана ў 1930 г.

На будаўнічых працах працуюць—760 рабочых, на цагельных заводах—500 чал. Тэмп працы на пабудовах за апошні час некалькі паменшыўся з-за крызісу ў вапне і цэглы.

Зараз распрацоўваецца пытаньне аб бязупынным рабочым годзе. У гэтым годзе праэктуецца праводзіць будаўнічыя работы і ўзімку. У зьніжэньні сабекошту ёсьць некаторыя дасягненьні. Сёлета, акрамя 5 проц. зьніжэньня на матар'ялах, таксама будзе дасягнута зьніжэньне ў 1 з пал. проц.—па правядзеньні работ бяз лёсаў.

Агульны процант зьніжэньня дасягне—8.

Адміністрацыйна-гаспадарчыя выдаткі зьніжаны на 8,8 проц. Недастаткова праходзіць зьніжэньне на цагельных заводах. Пляны нераспрацаваны, але ўсё-ж мяркуецца зьменшыць сабекошт на 5-6 проц.

Прэзыдыум саюзу намеціў шэраг мерапрыемстваў па палепшаньні працы на пабудовах, а таксама ў зьніжэньні сабекошту.

Самалёт „Сялянская ўзаемадапамога БССР".

У сучасны момант шырока разгарнуўся збор сродкаў на пабудову самалёта імя сялянскай узаемадапамогі БССР. Да гэтага часу ўжо сабрана 1145 р. Дрыбенскі РКСТУ Аршанскай акругі ўнёс на пабудову самалёту 120 р. і заклікае ўзяць прыклад з яго ўсе раённыя КСТУ.

Адбор экспанатаў для ўсебеларускай выстаўкі.

Сёлета на с.-г. выстаўках у дзень ураджаю ва ўсіх раёнах БССР будзе праводзіцца адбор экспанатаў на ўсебеларускую выстаўку сельскай гаспадаркі. Будуць адбірацца тыя экспанаты, якія можна будзе захаваць [illegible] працягу 9-[illegible] месяцаў.

Падрыхтоўка да будаўніцтва дзіцячай камуны.

Зараз праводзіцца праца па складаньню праэктаў па будаўніцтву вузорнай дзіцячай камуны імя 10-цігодзьдзя БССР. Адначасова в гэтым мэтадалёгічны камітэт Наркамасьветы распрацоўвае мэтавую установку камуны.

Дзіцячая камуна будзе будавацца ў г. Магілеве.

Агульна-гарадзкая нарада прафактыву.

У бліжэйшы час ЦСПСБ склікае пашыраную агульна-гарадзкую нараду прафактыву Менску.

Нарада абгаворыць пытаньне аб выніках абсьледваньня дзейнасьці прафсаюзаў Беларусі.

Для дакладу прыяжджае прадстаўнік Прэзыдыуму УсеЦСПС.

Яшчэ 90 новых настаўнікаў.

15 верасьня заканчваюць працу 6-месячныя курсы па падрыхтоўкі настаўніцтва. З курсаў будзе выпушчана каля 90 настаўнікаў, якія будуць накіраваны для працы ў вясковыя пачатковыя школы.

Курсы па падрыхтоўцы вылучэнцаў.

Наркамасьветы арганізуе па ўсіх акруговых цэнтрах БССР 3-х месячныя курсы для падрыхтоўкі вылучэнцаў. Курсы распачнуць сваю працу з 1 кастрычніка, на кожных курсах будзе навучацца да 50 чалавек вылучэнцаў. На ўтрыманьне кожных курсаў адпушчана па 1000 руб.

Сацыялістычныя спаборніцтвы на мёртвым пункту.

Прэзыдыум ЦП саюзу тэкстыльшчыкаў разглядзеў пытаньне аб выніках сацыялістычных спаборніцтваў на ф-ке ім. К. Маркса.

— Як відаць з матар'ялаў, дырэктывы саюзу ня выконваліся, ня прымаліся заходы да ажыўленьня працы вытворчых нарад і камісій.

З боку адміністрацыі зварочвалася мала ўвагі спаборніцтвам

Ня прыняты меры да ўтварэньня фонду прэміраваньня.

Прэзыдыум саюзу парашыў правесьці вытворчую канфэрэнцыю рабочых для распрацоўкі пытаньня аб спаборніцтвах.

30.000 пуд. насеньня бяднейшаму насельніцтву.

Для забесьпячэньня бяднейшага насельніцтва і пацярпеўшых ад градабіцьця патрэбным насеньнем па ўсіх акругах БССР разьмеркавана 30.000 пуд. сартавога жыта. Насеньне будзе выдавацца ў крэдыт.

Барацьба з жабрацтвам.

У апошнія часы ў буйнейшых пунктах БССР—Менску, Гомелі, Віцебску і Магілеве—разьвялося шмат жабракоў-прафэсыяналаў.

У сувязі з гэтым Нарком Сацыяльнай Забясьпекі зьвярнуўся з дырэктывай да акруговых інспэктароў сацыяльнай забясьпекі ўжыць рашучую барацьбу з гэтым злом.

Дзеля выпрацоўкі мерапрыемстваў у гэтай галіне будуць склікацца нарады з удзелам зацікаўленых арганізацый. Усе жабракі-прафэсыяналы будуць зьмешчаны ў прытулкі.

Праверка жыльлёвага пляцу.

Гэтымі днямі распачынаецца плянавая праверка жыльлёвага пляцу з мэтаю ўшчыльненьня кватарантаў, калі яны займаюць больш пляцу, чым гэта вызначана па закону.

Праверка будзе праводзіцца як у камгаскіх і жактаўскіх, так і ў прыватніцкіх дамох.

Мэханізацыя працы на цагельных заводах.

Белбумтрэст вызначыў 500 тыс. руб. на мэханізацыю прац на цагельных заводах Беларусі.

Па пляну будуць поўнасьцю мэханізаваны некаторыя цагельні ў Менскай, Гомельскай, Магілёўскай і Віцебскай акругі.

Таксама пачалася мэханізацыя работ на Барысаўскіх цагельных заводах.

Фізкультура і спорт

Сустрэча па тэнісу з украінскімі фізкультурнікамі.

На працягу двух дзён (субота і нядзеля) адбылася сустрэча Менскай і Кіеўскай каманды па тэнісу.

У выніку спаборніцтваў перамога засталася за камандай Менску (4:3) гульні былі зазьняты апаратарам Белдзяржкіно.

Футбольныя сустрэчы.

У нядзелю 1 верасьня на спортпляцоўцы „Профінтэрн" адбыліся спартыўныя гульні паміж рабочымі гурткамі.

Сустрэча па футболу каманды мэталістых і нарсувязі скончылася з разьлікам 3:2 на карысьць мэталістаў.

Акрамя таго былі праведзены таварыскія сустрэчы па валей-болу, гарадкі і інш.

ПАМЯЦІ ПАЎЛЮКА ТРУСА.

На пахаваньні.

2-га верасьня б. г. Менск з болем пахаваў выдатнага беларускага пралетарскага паэта маладога Паўлюка Труса.

* * *

З дзесяці гадзін раніцы пад жалобным сьцягам, павешаным над дзьвярыма Дому Пісьменьніка, вакол жалобнай абвесткі сталі зьбірацца людзі, галоўным чынам,—моладзь. Цела нябожчыка ў Доме ящчэ ня было, але яго чакалі з хвіліны на хвіліну. Нарэшце прывезьлі і, падрываючы сэрца, паэту сустрэў жалобны марш... Паўлюк Трус апошні раз прышоў у Дом Пісьменьніка, каб потым назаўсёды яго пакінуць...

У залі Дому не прабіцца за моладзьдзю, якая прышла апошні раз разьвітацца з сваім песьняром. Нясупынным ручаём вакол дамавіны цякуць усё новыя і новыя твары. Каля дамавіны, засыпанай кветкамі кожныя дзесяць—пятнаццаць хвілін зьмяняецца ганаровая варта. Акамянелыя ў нярухомай суровасьці твары паэтаў і пісьменьнікаў вылучаюцца на фоне кветак. Яны вартуюць спакой засьнуўшага барацьбіта, таварыша.

Пасьля двух гадзін жалобная працэсія, разьдзіраючы шумную сымфонію вялікага гарадзкога будаўніцтва гнеўна-трывожнымі мэлёдыямі жалобных маршаў паўзе праз пыльны горад на вайсковыя могілкі.

Ціха шумяць сосны на могілках. Тыя сосны, пра якія паэта так часта сьпяваў пры жыцьці:

... І застыглі
дзьве хваіны.

толькі ня „ў полі кветарунным", а над магілаю песьняра.

— Са сьмерцю Паўлюка Труса ў шэрагах барацьбітоў за гегемонію беларускай пралетарскай літаратуры ўтварыўся вялікі правал. І мы павінны гэты правал запоўніць новымі байцамі,—гаворыць тав. Канакоцін, заг. аддзелу друку ЦК КП(б)Б.

Народны паэта БССР Якуб Колас выказвае свой вялікі жаль з прычыны сьмерці малодшага таварыша і ўпартага барацьбіта.

Над магілаю выступалі з кароткімі жалобнымі прамовамі: сэкратар ЦК ЛКСМБ, пісьменьнік Галавач, сябра „Узвышша"—А. Бабарэка, сябра БелАПП'у—Р. Мурашка і інш.

Глыбока ў сэрцах расьце сталёвая рашучасьць: шчыльней самкнём шэрагі над магілаю барацьбіта. Яшчэ больш упарта і бязьлітасна будзем змагацца на ідэалёгічным фронце за канчатковую перамогу пралетарскага мастацтва. І гэта будзе лепшым помнікам на магілу заўчасна загінуўшага барацьбіта, таварыша, паэты—Паўлюка Труса!

Б. Мік.

Да ўсіх арганізацый Асоавіяхіму.

У сучасныя дні сталі паступаць з некаторых акругоў (Гомель, Бабруйск, Магілеў) зьвесткі, што паявіўся масавы шкоднік сельскае гаспадаркі—усё зьнішчаючы лугавы матыль.

ЦС Беласовіяхіму зварачваецца да ўсіх нізавых арганізацый Асоавіяхіму (ячэйкам, Райсаветам і Акрсаветам), а таксама і да асобных членаў Асоавіяхіму, асабліва вёсцы, у мясцох дзе паявіўся, альбо пагражаемых мясцох, мабілізаваць усе сілы сваёй арганізацыі на дапамогу аграномічным сілам зямельных органаў, якія праводзяць барацьбу з паказаным шкоднікам.

Раённыя асоавіяхімаўскія ячэйкі па барацьбе са шкоднікамі с.-гаспад. усе, як адзін, павінны аддаць сябе ў распараджэньне агранома да поўнага скончэньня барацьбы.

Неабходна прыняць усе меры, каб шкоднік быў зьнішчан, а не распаўсюджваўся далей на непашкоджаныя месцы, альбо пладзіўся.

Стварыце моцныя атрады па барацьбе са шкоднікамі і перадайце іх у распараджэньне зямельных ворганаў. Вядзіце нагляд і пры нават незначным паяўленьні шкодніка самым тэрміновым парадкам давядзіце да ведама зямельных органаў, сельсавета, райвыканкому і райсавету Асовіяхіму.

Дбайнасьць і дружная работа спасуць сотні тысяч кілёграм хлеба і гароднікі.

ЦС Беласовіяхіму.

РАБСЕЛЬКОРЫ НАМ ПІШУЦЬ.

У вёсцы Старына, Карзуноўскага сельсавету, Сьмілаўскага раёну сяляне правялі самаабкладаньне і сабралі грошы на пабудову лазьні. Але РВК і сельсавет лазьні ня будуюць, бярвеньне гніе. Чаму нашы грошы і бярвеньне прападаюць—не вядома.

* *

Бабруйскае аддзяленьне саюзу спажывецкіх таварыстваў аб'явіла конкурс на лепшы сельсавет па здачы рознага роду сырцу. Конкурс, будучы шырока папулярызаваным, уцягнуў у спаборніцтва па дастаўцы сырцу.

Полацкі ЦРК за ўзвышаную плату рабочым на прадпрыемства прывозіць вельмі дрэнныя абеды. Былі выпадкі, што рабочым прывозілі ўчарашнія абеды, крыху іх падагрэўшы. Хлеб таксама прывозяць на завод тухлы, якога ў горадзе ніхто не бярэ. Рабочыя вельмі абураны.

* *

Запясоцкі сельсавет Тураўскага раёну займаецца валакітай са справаю ўзысканьня штрафу за ўкрываньне аб'ектаў ападаткаваньня з грам. сяла Запясочча Струна Зьмітрака. Справа цягнецца некалькі месяцаў і канца ёй няма.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 4-е ВЕРАСЬНЯ 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.89,5	
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	126.50	128.50
Выйгр. пазыка 1929 г.	101.75	102.15
10 проц. выйгр. пазыка 1927 г.	25.19	25.29
3-я сялянск. выйгр. паз. 1927 г.	5.03	
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.35	10.70
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.65	25.75
2 „ „ „ проц.	25.31	25.41
„ „ „ „ 6-проц.	25.69	25.79
ІІ проц. дзярж. паз. 28 г.	100.06	100.13
12 проц. рэнтная пазыка 1927 г.	103.06	—

НОВЫЯ КНІГІ.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя часопісі.

1. „Литература и марксизм" кн. 3. Журнал тэорыі, гісторыі і літаратуры. Стар. 207, цана 1 руб. Дзяржаўнага Выдавецтва РСФСР.
2. „Статистическое обозрение" № 5. Стар. 158, цана 1 руб. 75 кап. Выданьне ЦСУ Саюзу ССР.
3. „Шляхі калектывізацыі" № 1. Часопіс калектывізацыі, вытворчага с.-г. каапэраваньня і аграномізацыі насельніцтва. Стар. 55, цана 20 кап. Выданьне Наркамзему, Белкалгассаюзу і Белсельсаюзу БССР.

Часова выкон. абавязкі адказнага рэдактара П. ШАСТАКОЎ

Дырэкцыя і мясцовы камітэт БДТ-1 выказвае вялікае спадчуваньне працаўніку БДТ-1 т. ТЭРАЎСКАМУ Уладземіру Васільлевічу з прычыны сьмерці яго жонкі

Надзеі Прохараўны.

Дырэкцыя і мясцком БДТ-1.

Арцель імя „Леніна" Лепельскага раёну Пол. акр.

ПРАДАЕ

100 вазонаў пальм і 100 мірт

Жадаючым купіць—належыць зьвяртацца па адрэсу: п/а Несіна, Лепельскага раёну, с/г. арцель імя Леніна (бышая гаспадарка Мароза).

ВЫПІС

з зацьверджанага агульнага балянсу па працоўным часткам Справіцельных устаноў Н. К. У. С. БССР на 1927-28 г.

Па Гомельскаму Спраўдому.

Актыў:

Маемасьць	
Будынкі і пабудовы	45705—37
Абсталяваньне машыны і інструм. і інвэнтар.	20438—58
Жывы інвэнтар	2875 —
Матар'яльн. каштоўн.	
Матар'ялы	25111—82
Тавары і гатовы выраб.	
Гатов. вырабы	13413—39
Гатоўныя сродкі	
Каса	624—81
Бягучы рахунак	31—30
Каштоўныя паперы	
Цэнныя паперы	1496—31
Пад'адказн. сумы	
Пад'адказн. асобы	1108—56
Дэбітоsры	
Дэбіторы	11641—53
Самніцельн. даўжнікі	3612—33
Вэксалі ў партфэлі	6016 —
Вэксалі на вучоце	15301—50
Выдаткі	
Рабочых і служачых	6395—90
Фонды	
Культасьветн.	1808—18
Дапамога зьнявол.	257—87
Паляпшэньне харчаваньня зьнявол.	2995—95
Усяго	158834—40

Пасыў:

Капіталы	
Аснаўны	42576—39
Зваротны	13655—21
Амартызацыя	2837—35
Фонды	
12% на паляпш. харчаван. зьняволеных	283—33
8% дап. зьвалн. зьнявол. культасьвет. выдаткі	662—33
На пакрыцьце самніцельных даўгоў	3612—33
Крэдыторы	
Розн. устан. і асоб	26732—84
Зьняволеныя	1187—80
Банк па вучоту	15301—50
Вэксалі выдадзеныя	24649—79
Прыбытак	27335—53
Усяго	158834—40

ВЫПІС

з зацьверджанага агульнага разьмеркаваньня прыбыткаў па балянсу працоўных частак НКУС БССР на 27-28 г. г.

ПА ГОМЕЛЬСКАМУ СПРАЎДОМУ.

Назва ўстановы	Усяго паступ. прыб. ад вытв. прадпрыемств.	% % адлічэньне прыбыткаў: 15% у дз. бюджэт	60% на пашыр. вытв. спраў уст.	12% на паляпш. харч. зьнявол.	12% на ворганы дапам. зьняволен.	5% на культур. асьвет. патрэбы.	Ад знадворн. асэнізац. і інш. прац. на пашырэньне вытворчасьці	УСЯГО
Гомельскі Спраўдом	23945-37	3390-73	14544-13	2712-62	1988 —	1309-84	3390-16	27335-53
УСЯГО...	23945-37	3390-73	14544-13	2712-62	1988 —	1309-84	3390-16	27335-53

Нам. нач. Гом. СПД Банузов   Заг. Працчасткі Рысін

Бухгальтэр Гальперын

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.

ГАСТРОЛІ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ [illegible]

Серада, 4-га верасьня

„ПОДВЯЗКА БОРДЖИА" у 3 дзеях Крауса

Пачатак а 8 з пал. гадзіне.

КІНО-САД „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Савецкая № 71.

Ад аўторка 3-га. Вечары старадаўняе фільмы. Разьвіцьцё кіно-камэдыі ад 1905—1927 г.

10 сусьветных комікаў у 10 камэдыях у адзін сэанс.

Пачатак 1-га сэансу а 9 г. Каса ад 7 гадз.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА".

Ад аўторка 3 верасьня

Амэрыканскі высока мастацкі баявік, выпуску 1929 г.

ЧЫКАГА

рэжысэр Франк Уроон, кіраўнік пастаноўкі Сесіль Дэ-Міль.

Пачатак а 7 г.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ".

Ад аўторка 3 верасьня

мастацк. фільм **Цана чалавека.**

Драма з сучасн. жыцьця ў 6 частках.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ

Ад аўторка 3-га верасьня.

ПАТ І ПАТАШОН

у новым замежным фільме.

СІЛА І ХАРАСТВО арыгінальная камэдыя ў 6 частках. Штодня 4 сэансы.

Пачатак 6 г. 30 хв., 8. 9 30 хв., 11 гадз. ўвеч.

Каса адчынена ад 5 гадз. 30 хв.

1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР".

Ад аўторка 3 верасьня

Новы цікавы фільм савецкай вытворчасьці

ПРЫГОДЫ ПАЎРУБЛЯ

у 6 частках.

Кіно адчынена штодня ад 2 гадз. дню.

Пачатак 1-га сэансу ад 3 гадз. 30 хв., II—ад 5 гадз.

ПА НЯДЗЕЛЯХ кіно адчынена ад 12 гадз. дню

Цана білету 10 кап.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 36

Менскага Гарадзкога Савету

аб правядзеньні ўсеагульнага абавязковага навучаньня ў гор. Менску.

3 жніўня 1929 году.

У мэтах далейшага правядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня ў горадзе Менску, Менгарсавет, на падставе пастановы ЦВК і СНК БССР ад 7-IV-26 году і ў выкананьне наказу выбаршчыкаў Гарсавету **пастанаўляе:**

1. Лічыць у 1929-30 навучальным годзе навучаньне ў 4-х гадовых школах і 1-м канцэнтры сямігодак усеагульным і абавязковым для дзяцей 8, 9 і 10 гадовага ўзросту ў гор. Менску і паселішчах абнятых гарадзкой мяжою.

2. Абавязаць усіх бацькоў і асоб іх замяняючых, якія пражываюць у гор. Менску, зьмясьціць дзяцей 8, 9 і 10 гадовага ўзросту ў адну з гарадзкіх 4-х гадовых школ, альбо ў сямігадовыя школы, дзе яны павінны навучацца да поўнага заканчэньня 4-х гадовай школы, альбо 1-га канцэнтру сямігодкі, для якой мэты зарэгістраваць у школах дзяцей 8, 9 і 10 гадовага ўзросту да 10 верасьня г. г. калі яны да гэтага часу яшчэ не зарэгістраваны.

Увага. Да 10 гадовага ўзросту адносяцца ўсе дзеці, якія нарадзіліся з 1-га верасьня 1918 г. па 1-ае верасьня 1919 г., да 9-ці гадовага ўзросту адносяцца ўсе дзеці, якія нарадзіліся 1-га верасьня 1919 г., па 1-ае верасьня 1920 г., да 8 гадовага ўзросту адносяцца дзеці, якія нарадзіліся з 1 верасьня 1920 г. па 1 верасьня 1921 г.

3. Асобы, якія ня маюць магчымасьці па тэй ці іншай прычыне пасылаць дзяцей падлягаючых абавязковаму навучаньню ў школы, павінны аб гэтым падаць заявы Інспэктару Нарасьветы.

4. Асобы, якія ўхіляцца без уважлівых прычын ад выкананьня пункту 2-га гэтай пастановы, будуць прыцягвацца да адказнасьці ў адміністрацыйным парадку штрафу да 100 руб., або прымусовых работ да 1 месяцу.

5. Агульны нагляд за выкананьнем гэтай пастановы ўскладаецца на Інспэктара-Нарасьветы.

За Старшыню Менгарсавету ПАСЫНКОЎСКІ.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Дапрыз. кніжка Мароза Н. В., выд Рэчыцк. РВК, кв. 555п.

— Пасьведч. асобы Серафімовіч Ф. А., выд. 2-м аддз. службы эксплёат. МББ чыг., кв. 566п.

— Пасьвед. аб сканчэньні школы Кулікова І., выд. Кругл. сямігодкай, кв. 539п.

— Сябр. кніжка № 6-26955 Антановіч А., выд. Мазырскім аддз. с-зу будаўнікоў, кв. 536п.

Галоўлітбел 595.

Менск, дзяржаўная друкарня